Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛЮТЫ 13 1933 г. № 34 (4578)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

Сеньня у нумары

Аб падрыхтоўцы рабочай скаціны да веснавой сяўбы — Пастанова СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) (1 стар.). Аб ходзе ільназагатовак — Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР (1 стар.)

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Асаблівую ўвагу падрыхтоўцы каня да сяўбы. БЭКЗК — Бальшавіцкая барацьба з гнілым лібералізмам — зарука поўнага выкананьня пляну ільназагатовак (4 стар.).

Народна-гаспадарчы плян 1933 г. — першага году другой пяцігодкі — Даклад старшыні СНК БССР тав. Галадзеда на 4-й сэсіі ЦВК БССР (2-3 стар.).

Прамова старшыні ЦКК і наркома РСІ БССР тав. Лычова на 4-й сэсіі ЦВК БССР (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Паўстаньне ў Галяндзкім флёце пашыраецца (1 стар.).

Французкая прэса абвінавачвае ў падпале «Атлянтыка» італьянцаў (1 стар.).

Армія беспрацоўных бязупынна расьце (1 стар.).

Среднее. Дзмитрев

Асаблівую ўвагу падрыхтоўцы каня да сяўбы

Урад і Цэнтральны Камітэт партыі апублікавалі учора пастанове «Аб падрыхтоўцы рабочай скаціны да веснавой сяўбы» зноў і зноў указваюць усім партыйным і савецкім арганізацыям на выключную важнасьць правільнага скарыстаньня і ўтрыманьня жывой цягавай сілы, асабліва каня ў саўгасах і калгасах. Краіна знаходзіцца напярэдадні веснавой пасеўнай кампаніі, калі за параўнаўча кароткі прамежак часу саўгасы і калгасы павінны будуць апрацаваць і засеяць каля 77 млн. га. Натуральна, што партыя ня можа ня цікавіць гатоўнасьць сацыялістычнага земляробства да выкананьня гэтай праграмы.

Ня прыходзіцца многа даказваць, якое вялізарнае значэньне для павышэньня ўраджайнасьці мае свячасова праведзеная сяўба. Кожны дзень спазьненьня ўносіць сотні тысяч тон прадукцыі, ускладняе далейшую работу, парушае плянавасьць гаспадаркі. У гэтым годзе, якім адкрываецца пяцігодка асваеньня новых прадпрыемстваў, пяцігодка якасьці, зусім недапушчальны страты ў сельскай гаспадарцы. Страты — гэта даніна дробна-буржуазнай расхлябанасьці, якая яшчэ ня зжыта ў калгаснай вытворчасьці, страты — гэта рэзультат часамі злачынай бестурботнасьці кіраўнікоў калгасаў да падрыхтоўкі працоўных працасаў. Страты ў сельскай гаспадарцы выклікаюцца, нарэшце, дзеяньнямі клясавых ворагаў, што прабраліся ў калгасныя рады і падрываюць грамадзкую ўласнасьць.

Пастанова Саўнаркому і ЦК накіравана да ліквідаваньня страт, яна завастрае ўвагу ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый на задачы **свячасовай** сяўбы, якая немагчыма без належнай падрыхтоўкі рабочай скаціны.

Сыстэматычны рост мэханізацыі сельскай гаспадаркі ні ў якой меры ня прыніжае вытворчага значэньня жывой цягавай сілы. Будаўніцтва МТС ня мае сваёй задачай выцясьніць з калгасных палёў каня. Наадварот, імкненьне **спалучэньне мэханічнай трактарнай цягі з коннай цягай калгасаў і зьяўляецца асноўным прынцыпам вытворчай дзейнасьці МТС.** Пралетарская дзяржава ў абліччы машынна-трактарнай станцыі аказвае пастаянную дапамогу калгасам трактарнай апрацоўкай іх палёў, патрабуючы ад калгасаў поўнага скарыстаньня на палявых работах усёй рабочай скаціны. За пэрыяд суцэльнай калектывізацыі ня раз і ня два выкрывалася і сурова асуджалася як у тэорыі, так і на практыцы спробы паасобных галавацяпаў і загібшчыкаў «скасаваць» каня.

Партыя з усёй сілай абрушвалася на тых, хто на-франжэвіцку адносіўся да каня, злачынна ігнараваў задачу адпаўленьня і разьвіцьця каняводчай гаспадаркі. На практыцы даказана, хоць**я** на прыкладзе Украіны, НКЗ якога мала цікавіўся становішчам конскага стада ў калгасах і саўгасах, да чаго прыводзіць усякая недаацэнка каня.

Но ворны пералом у справе становішча конскага стада ў саўгасах і калгасах, які намецілся, ніяк ня можа быць прызнан выстарчальным. Ва многіх раёнах яшчэ ня спынілася падзёж рабочай скаціны. Па-ранейшаму пануе абязьлічка ў догляде жывёлы, яшчэ ёсьць шмат фактаў дрэннай пастаноўкі кармленьня і скарыстаньня жывой цягавай сілы.

Такія факты маюць месца таму, што вельмі і вельмі рэдка ячэйкі і райкомы цікавяцца становішчам калгасных стайняў. Такія факты яшчэ могуць паўтарыцца ў тым выпадку, калі партыйныя і камсамольскія арганізацыі будуць стаяць у баку ад гэтай работы. Камуністы і камсамольцы павінны ня толькі ўзяць над сваёй увагай падрыхтоўку каня да веснавой сяўбы, але і сваёй асабістай работай паказаць прыклад сацыялістычных адносін да спраў. Вось чаму ўрад і Цэнтральны Камітэт партыі лічаць неабходным: **«Усіх членаў партыі і камсамольцаў калгасаў і саўгасаў абавязаць быць прыкладам для ўсіх калгаснікаў і саўгасных рабочых у справе правільнага скарыстаньня, догляду і беражлівых гаспадарчых адносін да рабочай жывёлы і, ў першую чаргу, да каня».**

Асноўная задача заключаецца ў тым, каб уся рабочая скаціна саўгасаў і калгасаў выйшла на палявыя работы ўмацаванай і зусім здаровай. Скарыстаньне жывой цягі ў часе сяўбы павінна быць арганізавана такім чынам, каб жывёла захавала поўную працаздольнасьць на ўсе наступныя сельска-гаспадарчыя работы. Нарэшце, практычна трэба забясьпечыць адпаўленьне конскага стада. Натуральна, што гэтыя задачы ня могуць быць пасьпяхова вырашаны бяз самага шырокага прыцягненьня да справы **перадавых калгаснікаў-ударнікаў.**

Вялікае значэньне набывае безадкладная разьбіўка коняй на працаздольных і слабасільных з тым, каб слабасільныя ўжо зараз былі пастаўлены на падкорм. У вытвараючых раёнах, як **Паўночны Каўказ, Украіна, Сярэдняя Волга, Ніжняя Волга** за тры тыдні да пачатку сяўбы павінны быць пастаўлены на падкорм і поўны адпачынак і ўсе працаздольныя коні, паколькі тут на долю конскай цягі прыпадае значная частка работы.

Зараз пэрначарговым абавязкам сельскіх партарганізацый, старшынь калгасаў і дырэктароў саўгасаў зьяўляецца вылучэньне і бранзаваньне грубых і каменцтраваных кармоў, якіх павінна хапіць на ўвесь пэрыяд падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі. Шырока павінны быць скарыстаны побач з сенам, саломай і мякінай адкіды ад ачысткі насеньня, розныя мшавыя адкіды і вотруб. Кармы ў саўгасах і калгасах ёсьць, патрэбны толькі гнэргія і ініцыятыва для таго, каб іх сабраць і захаваць.

Буйнейшае значэньне мае пытаньне, хто даглядае каня. Не сакрэт, што сярод калгасных конюхаў ёсьць нямала клясава-чужых элемэнтаў, злодзеяў і п'яніц. Корм, прызначаны для каня, вельмі часта ідзе на бок, за канём няма любоўнага догляду. Вось чаму Саўнарком і ЦК прапануюць саўгасам і калгасам **не пазьней 1 сакавіка праверыць склад конюхаў і залоўнікаў, не дапусьціць да догляду каня ўвесь сацыяльна-чужы элемэнт,** жорстка карань раскрадальнікаў кармоў.

Вырастае роля калгаснай брыгады і брыгадзіра. Брыгадзір адказвае за правільнасьць разьбіўкі коняй, яму даверяюцца вылучаныя кармы. Брыгада шчыльна падыходзіць да падрыхтоўкі каня да палявых работ і яна непасрэдна зацікаўлена ў тым, каб захаваць рабочую жывёлу, выйграць час у пэрыяд сяўбы, даць лішнюю якасьць апрацоўцы глебы. Разам з конюхам даглядаюць каня ўсе калгаснікі, якія будуць на іх працаваць. Гэта будзе спрыяць правільнаму выдаткаваньню кормы, свячасоваму выданню. Конюх разам з калгаснікамі і брыгадзірам пакланяцца аб тым, каб конь быў падкаваны, вычышчаны, свячасова паказан вэтэрынарнаму доктару. Вопыт **Калачэўскага** раёну ПЧВ, дзе калгасныя брыгады ўзорна арганізавалі догляд каня і дзякуючы гэтаму пасьпяхова справіліся з сельска-гаспадарчымі работамі цалкам гэта пацьвярджае.

Асаблівыя задачы ўскладаюцца на МТС. Важлівай умовай узаемнага захаваньня заключаных дагавораў паміж МТС і калгасамі зьявіцца рацыянальнае скарыстаньне і захаваньне працоўнай жывёлы ў калгасах, якія МТС абслугоўваюцца. Дырэктары і палітаддзелы МТС не павінны цікавіцца толькі станам рамонту трактараў. Яны адказваюць таксама і за падрыхтоўку рабочай скаціны ў тых калгасах, якія імі абслугоўваюцца.

Падрыхтоўка каня да веснавой сяўбы становіцца адной з важнейшых задач партарганізацыі. Пастанова ўраду і Цэнтральнага Камітэту дае шырокую праграму практычных дзеяньняў. Зараз уся справа заключаецца ў тым, каб правесьці гэтыя мерапрыемствы ў жыцьцё і рапаючым у гэтай рабоце зьяўляецца тое, як сама партарганізацыя мабілізуе свае рады. **Паменш траскучых рэзалюцый, побольш практычнай работы ў калгасных вытворчасьцях на полі, у майстэрні, на фэрме.**

Нельга забываць таго, што калі мы ня кіруем калгасамі, дык кіруе імі клясавы вораг. Калі на калгаснай стайні няма партыйнага вока, дык там гаспадарнічае кулак, зморваючы каня, крадучы ў яго корм. Ці-ж гэта не палегчыла пекаторым прафэсарам-шкоднікам, якія прабраліся ў апараты Наркамзему СССР і яго вэтэрынарныя органы, выклікаць сярод калгасных коняй эпідэмічныя захворваньні?

Клясавы вораг добра ўлічвае, што калгасная стайня зьяўляецца адной з камандных вышынь у калгасах і імкнецца яе захапіць. Вось чаму ад мясцовых, партыйных і савецкіх арганізацый патрабуецца бязупынная ўвага да гэтага вузлістку калгаснай вытворчасьці, калі яны хочуць пасьпяхова правесьці веснавую сяўбу. (Скарочаная перадавая «Правды», перапал из радыё).

Аб падрыхтоўцы рабочай скаціны да веснавой сяўбы

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б)

Посьпех веснавой сяўбы і ў асаблівасьці тэрміны не правядзеньня будуць залежаць, галоўным чынам, ад стану і належнай падрыхтоўкі да веснавых работ рабочай скаціны і ў першую чаргу каня. Ня гледзячы на неаднаразовыя ўказаньні партыі і ўраду на неабходнасьць рашучага паляпшэньня догляду, выкарыстаньня і зьберажэньня конскага пагалоўя ў калгасах і саўгасах, пораней, што намецілася ў гэтай справе, усё яшчэ яўна незьстарчальны.

Неахайны, абязьлічаны догляд каня, няправільнае, часамі драпежніцкае выкарыстаньне, дрэнная пастаноўка кармленьня ставяць пад пагрозу ў радзе калгасаў выкананьне пляну сяўбы і, перш за ўсё, тэрміны яе правядзеньня.

У мэтах найбольш дакладнай падрыхтоўкі рабочай жывёлы (коняй, валоў і вярблюдаў) да веснавой пасеўнай кампаніі, Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) ПАСТАНАВЯЛЯЮЦЬ:

1. Не пазьней 20 лютага правесьці пад асабістай адказнасьцю старшыні калгасу і дырэктара саўгасу дакладны агляд усяго конскага складу ва ўсіх калгасах і саўгасах і разьбіць яго на дзьве групы—працаздольных і слабасільных.

Усіх слабасільных коняй неадкладна вызваліць ад якіх-бы там ні было работ і паставіць іх на ўзмоцнены падкорм з тым, каб да пачатку веснавой сяўбы поўнасьцю адновіць іх працаздольнасьць.

Працаздольных коняй у вытвараючых абласьцях (Паўночны Каўказ, Украіна, Сярэдняя Волга, Ніжняя Волга) паставіць на поўны адпачынак і падкорм за тры тыдні да пачатку сяўбы.

Усіх жарэбных матак абавязкова вызваліць ад цяжкай работы за два месяцы да жарабеньня і дапускаць да работы не раней чым праз месяц пасьля жарабеньня.

Адказнасьць за правядзеньне гэтага мерапрыемства па кожнай брыгадзе нясе брыгадзір, а па калгасе ў цэлым—старшыня калгасу: кантроль за яго правядзеньнем і аміцыцяўленьнем ускладаецца на старшыню сельсавету і сакратара партсельячэйкі.

2. Пад адказнасьцю старшынь калгасаў і дырэктароў саўгасаў выдзеліць і забраніраваць ва ўсіх калгасах і саўгасах неабходную колькасьць грубых кармоў (сена, саломы і паловы) лепшай якасьці з разьліку 10-12 клг. у дзень на кожнага каня, 18-20 кгр. на кожнага вала і ня менш 2-3 цэнтн. канцэнтраваных кармоў на кожнага каня на ўвесь пэрыяд пасеўнай кампаніі, выкарыстаўшы для гэтага ў першую чаргу адкіды ад ачысткі і сартаваньня насеньня, мшавыя адкіды і высеўкі.

Выдзеленыя кармы павінны паступіць у распараджэньне брыгадзіра і выдаткоўвацца з такім разьлікам, каб іх хапіла на ўвесь пэрыяд падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі.

Абавязаць старшынь абласных і краёвых выканкомаў неадкладна перакінуць у калгасы, якія адчуваюць патрэбу ў грубых кармах, неабходную колькасьць гэтых кармоў з раёнаў, маючых лішкі грубых кармоў.

Пад адказнасьцю тых-жа асоб (старшынь калгасаў і дырэктароў саўгасаў) наладзіць кармленьне коняй з найлепшым выкарыстаньнем грубых кармоў (абавязковую дробную сечку салому, запарку сечкі і паловы, мешаніну, свячасовы падпой і інш.).

3. Прыняць меры да сапраўднай аховы выдзеленых кармоў. За ўстанае раскрадальнае і разбазарванае кармовых фондаў у калгасах і саўгасах вінаватых прыцягваць да крымінальнай адказнасьці згодна закону аб аховe грамадзкай уласнасьці.

4. Абавязкова ўвесьці там, дзе гэта яшчэ не арганізавана, штодзённую чыстку коняй свячасовую расчыстку капытоў.

Старшыням калгасаў і брыгадзірам наглядаць за тым, каб усе рабочыя кані былі абавязкова свячасова і правільна падкаваны.

5. Прапанаваць усім дырэктарам саўгасаў і праўленьням калгасаў не пазьней 1-га сакавіка праверыць увесь склад конюхаў і валоўнікаў з тым, каб на гэту важнейшую работу былі пастаўлены толькі праверанныя і зусім добрасумленныя калгаснікі і рабочыя саўгасаў; увесь сацыяльна-чужы элемэнт неадкладна адкінуць ад догляду каня. Адабраны склад конюхаў павінен быць замацаваны, як пастаянны, з нагрузкай ня звыш 10 рабочых коняй на конюха.

6. У мэтах ліквідацыі абязьлічкі ў выкарыстаньні коняй прымацаваць да кожнай пары коняй калгаснікаў, працуючага на іх на працягу ўсяго пэрыяду сельска-гаспадарчых работ і ўскласьці на яго, побач з конюхам, адказнасьць за захаваньне, бярэжлівыя адносіны і свячасовае кармленьне перададных яму коняй.

7. Уся рабочая скаціна калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС, павінна быць поўнасьцю выкарыстана на палявых работах. Усклаасьці на дырэктара МТС адказнасьць за рацыянальнае выкарыстаньне і захаваньне рабочай скаціны калгасаў, якія яны абслугоўваюць, а таксама правільнае размеркаваньне палявых работ паміж трактарамі і жывой цягавай сілай.

8. Абавязаць палітаддзелы МТС і саўгасаў у раёнах, якія імі абслугоўваюцца, выдзеліць, у якасьці важнейшай задачы сваёй работы, падрыхтоўку коняй да веснавой сяўбы—правільнае іх выкарыстаньне, догляд і ўтрыманьне.

9. Ва ўсіх калгасах і саўгасах у часе веснавой пасеўнай кампаніі ўстанавіць абавязковы штодзённы адпачынак рабочых коняй.

Пры ўстанаўленьні норм выпрацоўкі для коняй, разьбіць іх па працаздольнасьці на асобныя групы і ўстанавіць нормы асобна для кожнай групы.

Абавязаць калгасы і саўгасы свячасова падрыхтаваць і адрэмантаваць усю вупраж, і прымацаваць да кожнага каня пастаянны падагнаны да яго камплект.

Адказнасьць за спраўны стан вупражы ўскласьці на конюха і працуючага на даным кані калгасніка.

10. З прычыны таго, што злучная кампанія супадае з часам веснавой сяўбы, у мэтах нармальнага адпаўленьня конскага пагалоўя абавязаць брыгадзірэў і старшынь калгасаў і дырэктароў саўгасаў свячасова пусьціць у злучку ўсіх матак, годных для расплоду. Кантроль і праверка фактычнага правядзеньня злучнай кампаніі ўскладаецца на парторганізацыю і сельсаветы.

11. Райкомам і РВК арганізаваць вэтэрынарны агляд усёй рабочай скаціны ў пэрыяд падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і ўзмацніць вэтэрынарнае абслугоўваньне на ўвесь пэрыяд веснавых палявых работ, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на барацьбу з каростай.

12. Забараніць усякае правядзеньне гужавой павіннасьці да сканчэньня веснавой пасеўнай кампаніі, а таксама катэгарычна забараніць пад адказнасьцю старшынь РВК і старшынь сельсаветаў выкарыстаньне коняй калгасаў для разьездаў розных упаўнаважаных як мясцовых, так і ўсіх іншых арганізацый, да цэнтральных уключна.

13. Асоб, вінаватых у няправільным, драпежніцкім выкарыстаньні каня (празьмерная непасільная перагрузка, зьбіваньне, гонка, няправільнае запраганьне і інш.) прыцягваць ад суровай судовай адказнасьці.

Мясцовым органам улады і пракуратуры не пакідаць без расьсьледаваньня ні аднаго выпадку падзежу рабочай скаціны і прыцягваць вінаватых у падпалах да суровай адказнасьці.

Пракуратуры ўзмацніць нагляд за выкананьнем пастановы ЦВК і СНК СССР аб разьвіцьці і захаваньні конскага пагалоўя ад 27 мая 1932 г.

Катэгарычна забараніць Дзяржстраху выдаваць страхавыя прэміі за падзеж жывёлы ад змораванасьці або драпежніцкай эксплёатацыі.

14. Усіх членаў партыі і камсамольцаў калгасаў і саўгасаў абавязаць быць прыкладам для ўсіх калгаснікаў і саўгасных рабочых у справе правільнага выкарыстаньня, догляду і бярэжлівых, гаспадарных адносін да рабочай скаціны і ў першую галаву да каня.

Старшыня Саўнаркому Саюзу ССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар ЦК УсеКП(б) І. СТАЛІН.
10 лютага, 1933 году.

Аб ходзе ільназагатовак

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР

1. Заслухаўшы паведамленьні т. т. Бэнэка, Рыскіна, Вайновіча аб становішчы ходу ільназагатовак па БССР і даклады паасобных сакратароў РК, старшынь РВК і ўпаўнаважаных ЦК па раду раёнаў (Сіроцінскім, Талачынскім, Полацкім, Гарадоцкім, Лепельскім, Плешчаніцкім, Б.-Кашалёўскім, Веткаўскім і Расонскім), бюро ЦК КП(б)Б лічыць, што даныя аб выкананьні пляну ільназагатовак па БССР на 5 лютага 1933 г. (84,8 проц. выкананьня пляну) сведчаць аб зрыве выкананьня пляну ва ўстанаўлены ЦК КП(б)Б тэрмін як па рэспубліцы ў цэлым, так і па большасьці раёнаў БССР, што зьяўляецца вялікай ганьбай для ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый БССР.

2. Асабліва ганебным, проста злачынным зьяўляецца становішча ільназагатовак па наступных раёнах БССР: Сіроцінскім, Талачынскім, Полацкім, Гарадоцкім, Лепельскім, Веткаўскім, Расонскім, Асьвейскім, Мсьціслаўскім, Сеньненскім, Вушацкім, Бягомльскім, Клічаўскім, Камарынскім, Рэчыцкім, Заслаўскім, Віцебскім, Бярэзінскім, Чэрвеньскім і Брагінскім.

3. Такое ганебнае становішча ільназагатовак у гэтых раёнах зьявілася вынікам праяўленьня гнілога лібералізму, перажываньня і адсутнасьці на чуцьцё бальшавіцкай адказнасьці за выкананьне ў тэрмін важнейшых заданьняў партыі ня толькі значнай часткай радавых членаў партыі, больш шасьцю акцыяў, але і значнай часткай кіруючых работнікаў раённых партыйных і савецкіх арганізацый, іх простага папушчэньня ў адносінах да клясавага ворага.

4. Той факт, што рад раёнаў, свячасова выканаўшы свае заданьні (Чавусы, Ворша, Церахаўка, Касьцюковічы, Клімавічы, Магілеў і інш.) і рад раёнаў БССР, якія цягнуліся ў хвасьце па працягу ўсёй ільназагатоўчай кампаніі (на 1 лютага было выкана раённага пляну ў Шклоўскім 30,6 проц., Барысаве—49 проц., Буда Кашалёве—50 проц., пры сярэдні-рэспубліканскім на 1 лютага ў 81,8 проц.), пасьля пазадзжаньня выканалі больш 50 проц. усяго свайго гадавога пляну на працягу ўсяго толькі 6—7 дзён, даўны штодзённае пастуленьне 8—11 проц. гадавога пляну,—сьведчыць аб бязгаўпай магчымасьці поўнага выкананьня пляну па ўсіх раёнах БССР і што пры сапраўднай перабудове партыйных радоў, пры шучай барацьбе з гніла-перараджэнскімі элемэнтамі, максымальнай мабілізаванасьці партыйных і савецкіх арганізацый на баявое выкананьне нашчэйшых заданьняў партыі—можна да быцца тэмпаў, якія забясьпечваюць хуткае ня толькі ў тэрмін, але і датэрміновае выкананьне пляну загатовак.

Выходзячы з паказанага, ЦК КП(б)Б і СНК БССР **пастанаўляюць:**

1. а) У адносінах Мсьціслаўскага раёну: зьняць з работы старшыню РВК тав. Кадукова, як ня здолеўшага забясьпечыць выкананьне пляну ільназагатовак у раёне і што калі па прапаноўцы ЦК КП(б)Б ад 26 студзеня 1933 г., ня гледзячы на папярэджаньне і спра ў ЦКК.

Пытаньне аб тав. Рагалёнка—сакратары РК і тав. Бялуга—упаўнаважаны ЦК паклічуць адкрытым да звароту камісіі ЦК.

б) У адносінах Сіроцінскага раёну: з прычыны ганебнага становішча загатовак ільназагатовак у Сіроцінскім раёне, якое зьяўляецца вынікам злачынай недаацэнкі значэньня ільназагатовак як вядучай культуры ў раёне, з боку значнай часткі работнікаў раёну, у тым ліку кіруючых, дрэнкай работы кіруючых раённых партыйных і савецкіх арганізацый у справе барацьбы шавіцкай маўчэйшай партыйнай арганізацыі і арт[illegible] вак, абвясьціць [illegible] ду бюро РК, [illegible] і [illegible] нальна абвясьціць суровую вымову сакратару РК тав. Устенка, старшыні РВК—т. Разлоўскаму. Папярэдзіць гэтых т. т., што на іх лежыць персональная адказнасьць за далейшы ход ільназагатовак у раёне і што калі па прапаноўцы бліжэйшых 5-6 дзён ня будзе створан па Сіроцінскім раёне пералом, які забясьпечвае поўнае выкананьне пляну ільназагатовак у раёне,—ЦК і СНК вернуцца да абгаворэньня пытаньня аб дадатковых мерах спагнаньня.

в) У адносінах Полацкага раёну: за слабае кіраўніцтва загатоўкамі ільну (выканана 78,3 проц.), гніла-лібералы ныя адносіны да перараджэнцаў, кулацкіх агентаў унутры партыі (Ветрыльская МТС—Судніж і інш., Бэрко і інш.—Заскарскі сельсавет), якія яўна зрывалі ільназагатоўкі і ў адно слах да якіх з боку РК ня былі прыняты свячасова меры,—абвясьціць суровую вымову сакратару Полацкага РК тав. Пажыкаву і старшыні РВК тав. Шабанасу.

г) У адносінах Расонскага раёну: прыняць да ведама паведамленьне ЦКК, што Шкутко (былы старшыня Расонскага РВК) выключан з партыі за кулацкую лінію ў справе загатовак.

Абвясьціць суровую вымову сакратару РК тав. Карпыку за праяўленьне ім гніла-лібералых адносін да перараджэнцаў у арганізацыі, якія сарвалі ільназагатоўкі ў раёне.

д) У адносінах Талачынскага, Лепельскага і Веткаўскага раёнаў: за ледзь здавальняючае кіраўніцтва загатоўкамі ільну ў гэтых раёнах, дапушчэньне дэмабілізацыйных настрояў сярод партарганізацый, якія ставяць фактычна пад пагрозу выкананьне пляну ільназагатовак у гэтых раёнах,—абвясьціць вымову сакратарам РК названых раёнаў т. т. Славіну, Хіжынкову і Каўрыгіну і старшыням РВК т. т. Лагеравы, Нароенка і Слёзкіну.

2. Адзначыць упаўнаважаных ЦК і СНК па загатоўках ільну, якія ня справіліся з выкананьнем заданьняў партыі, з перадачай справы ў ЦКК для прыцягненьня да партыйнай адказнасьці, з наступных раёнаў: тав. Страноўскага (Лепельскі раён), Чуварава (Веткаўскі раён), Вяльчыка (Сіроцінскі раён), Прусакову (Бешанковіцкі раён), Брагінскіна (Полацкі раён), Рубэна (Гарадоцкі раён) Бэрэйта (Сеньненскі раён).

3. Прыдзячыць замест адкліканых упаўнаважаных ЦК і СНК наступных тавярышоў: у Лепель—тав. Нікалаева, Сяхно—Сугакова, Сіроцына—Гуровіча Н., Бешанковічы—Жукоўскіна, Полацак—Кроль, Гарадок—Рошаля.

4. Даручыць поза-прыпачаным упаўнаважаным ЦК і СНК у двухдзённы тэрмін выехаць на месцы пагрозных, неапрацаваных сябе брыгадзіраў, пасланых ЦК і РК па загатоўках, неадкладна адклікаць іх ад работы, перадаўшы справу ў ЦКК па пасланых брыгадзіраў ЦК, а РКК—пасланых РК, на прадмет прыцягненьня іх да суровай партыйнай адказнасьці.

5. РК і ўпаўнаважаным ЦК неадкладна адкінуць за правал работы брыгадзіраў ЦК і РК па сельсаветах і замяніць іх зусім працаздольнымі, больш стойкімі, адказнымі работнікамі раёну, патрабаваўшы ад іх сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за сканчэньне загатовак.

6. Даручыць агітпасу ЦК КП(б)Б у сутачны тэрмін мабілізаваць 20-25 адказных работнікаў, накіраваўшы іх у раён у дапамогу РК адстаючых раёнаў — па ўказаньні тав. Рыскіна.

7. ЦК і СНК лічаць зусім нецярпімай далейшую зацяжку ў справе поўнага выкананьня пляну ільназагатовак па БССР у цэлым і кожным раёнам у паасобку і папярэджваюць аб бязумоўнай неабходнасьці абавязковага сканчэньня ільназагатовак:

а) у нелільназодных раёнах, а таксама раёнах—Лёзьнянскім, Чашніцкім і Бялынічскім, не пазьней 15 лютага і б) на ўсіх іншых раёнах—не пазьней 20 лютага.

8. Адзначаючы недапушчальнае спыненьне радам раёнаў пасьлі што названых і пацьвярджаных вестак аб ходзе ільназагатовак, прапанаваць, пад асабістую адказнасьць старшынь РВК, забясьпечыць рэгулярную прысылку гэтых вестак цэнтральным арганізацыям. У прыватнасьці лічыць неабходным правесьці праз адпаведныя арганізацыі ўлік па БССР на пад ставе праверанных даных аб ходзе ільназагатовак па становішчы на 15 лютага ўключна і 20 лютага.

9. Лічыць недапушчальным аслабленьне за апошні час асьвятленьня ў друку як цэнтральным, так і раённым ходу ільназагатовак.

Прапанаваць «Зьвязьдзе» і інш. цэнтральным і раённым газэтам сыстэматычна асьвятляць ход загатовак, у прыватнасьці, адкінуць зьмяшчэньне водак у раённым разрэзе адзін раз у тры дні, перабудаваўшы іх на пісхозначай лініі са зьмяшчэньнем у чорнай рамцы адстаючых раёнаў.

10. Лічыць недапушчальнай практыку сакратара Гарадоцкага РК тав. Эльмана і старшыні РВК тав. Еўдасева па пасяджэньне «пяцёркі» на выклік ЦК. Патрабаваць ад іх тлумачэньня аб прычынах гэтага.

За мяжой

ПАЎСТАНЬНЕ Ў ГАЛЯНДЗКІМ ФЛЁЦЕ ПАШЫРАЕЦЦА

БЭРЛІН. Паводле вестак [illegible] дзкай газэты «Маасбодэ» з Сурабайя (морская база ў Галяндзкай Індыі) **хваляваньні выбухнулі таксама і на крэйсэры «Ява»,** яго, як вядома, стаіць на чале флётыліі, высланай супроць паўстаўшага браняносца «Дэ-зэвэн-Провінсіен». Падрабязных вестак аб характары гэтых хваляваньняў няма.

Як падае агэнцтва Вольфа з Амстэрдаму там атрыманы весткі, што рад нацыянальных арганізацый Галяндзкай Індыі прабуе арганізаваць дэманстрацыі салідарнасьці з паўстаўшым браняносцам.

Галяндзкі „Пацёмкін“ у агні

БЭРЛІН. 10-га лютага ў 5 гадзін 10 мінут раніцы паўстаўшы браняносец быў дагнаны ўрадавой эскадрай. Камандзір эскадры па радыё загадаў паўстаўшым бездакладна здацца. «Дэ-зэвэн-Провінсіен» адказаў радыёграмай, у якой паўтарыў ранейшыя ўмовы здачы. Радыёграма гэта канчалася словамі: **«Пакіньце нас у спакоі».** Пасьля гэтага самалёты пачалі атаку браняносца. Адна з кідутых бомб самалётам выбухнула на браняносцы і па ім пачаўся пажар. Камандзір эскадры па радыё загадаў браняносцу **вяртацца назад і відавочна зьбіраецца пакінуць палаючы браняносец.**

Далейшых вестак аб ходзе бою пакуль няма. Кінутай бомбай на паўстаўшы браняносец забіта 12 і паранена 25 чалавек каманды браняносца.

Прыбытак скараціўся ў 600 раз

БЭРЛІН, 8. Як піша нью-ёркскі карэспандэнт «Франкфуртэр Цэйтунг», буйнейшы амэрыканскі аўтамабільны канцэрн «Джэнэрал Маторс» скончыў у 1932 г. з прыбыткам 165 тыс. даляраў супроць прыбытку ў 96.880.000 даляраў у 1931 г. Прыбытак такім чынам скараціўся амаль у 600 раз.

Французкая прэса абвінавачвае ў падпале „Атлянтыка“ італьянцаў

РЫМ, 11. «Джорнале д'Італіа» называе «подлай выдумкай» паведамленьне некаторых французкіх газэт аб тым, што «Атлянтык» быў падпалены агентамі канкуруючых італьянскіх фірм. Спасылаючыся на водгукі скептыкаў аб тым, што пажар выклікан недахопамі канструкцыі, газэта піша: «Гэтыя паведамленьні зьяўляюцца спробай ачарніць рэпутацыю моцна скампрамэтаваных французкіх фірм. З гэтай мэтай яны прабуюць усклаасьці адказнасьць на італьянцаў».

ДРЭЙЗЭР, БАРБЮС, ШЭЙНАХ, ГОСІП І МЮНЦЭНБЭРГ ЕДУЦЬ У ШАНХАЙ

ПАРЫЖ. У сувязі з пастановамі на сьнежаньскім пасяджэньні ў Парыжы міжнароднага антываенрыялісцкага камітэту, бюро камітэту пад старшынствам Анры Барбюса пастанавіла паслаць у Манчжурыю камісію для вывучэньня становішча. Бюро пастанавіла ўключыць у гэту камісію вядомага амэрыканскага лісьменьніка **Тэодара Дрэйзэра,** ангельскага генэрала **Шэйнаха,** ангельскага прафсаюзнага лідэра і старшыню саюзу ангельскіх дрэваапрацоўшчыкаў **Госіпа** і дэпутата германскага рэйхстагу **Віллі Мюнцэнбэрга.** Акрамя таго, у гэтай камісіі прыме ўдзел і **сам Барбюс.**

Паводле вестак, усе вышэйназваныя асобы выказалі згоду прыняць удзел у гэтай камісіі.

Камісія ў сярэдзіне сакавіка выедзе з Парыжу праз Бэрлін у Манчжурыю. Яна правядзе ў Манчжурыі і пагранічных манчжурска-кітайскіх абласьцях некалькі тыдняў, пасьля чаго накіруецца ў Шанхай для дакладу аб результатах свайго абсьледаваньня на міжнароднай антываенай канфэрэнцыі.

У Шанхаі створан міжнародны камітэт пад старшынствам жонкі Сун Ят-сена, удавы **Сун Цзі-лін** для прыёму камісіі і арганізацыі антываеннай канфэрэнцыі, у якой прыйдзе удзел тысячы японскіх, кітайскіх і інш. дэлегатаў прассаюзаў і іншых арганізацый.

У Францыі, Англіі і Амэрыцы антываенныя камітэты пачалі збор сродкаў на фінансаваньне паездкі камісіі. У Францыі ўжо сабрана звыш 200 тысяч франкаў.

(«Вэльт ам Абэнд»).

Народна-гаспадарчы плян 1933 г.—першага году другой пяцігодкі

Даклад старшыні Савету Народных Камісараў БССР тав. ГАЛАДЗЕДА на IV сэсіі ЦВК БССР

Таварышы, работа нашай сэсіі праходзіць у пачатку новай гістарычнай пяцігодкі — на рубяжы другой пяцігодкі.

Рабочая кляса і ўсе працоўныя СССР падводзяць вынікі пераможнага выканаўння першай пяцігодкі за чатыры гады. Гэтыя вынікі падводзяцца ня толькі ў нас, у Савецкім саюзе, яны падводзяцца таксама і ва ўсіх капіталістычных краінах. Адны (рабочая кляса і працоўнае сялянства) разам з намі са здавальненьнем адзначаюць перамогі першай пяцігодкі ў СССР; другія (буржуазна-капіталістычныя колы) злобствуючь, імкнуцца затушаваць сусьветнае значэньне перамог пяцігодкі, а некаторыя з іх паказваюць зажмуранасьць перад тварам фактаў.

Той факт, што аб выніках выкананьня нашай бальшавіцкай пяцігодкі гаворыць увесь сьвет, азначае, што наша будаўніцтва, наша пяцігодка мае сапраўды сусьветна-гістарычнае значэньне.

Дазвольце і мне, таварышы, мой даклад аб народна - гаспадарчым пляне 1933 году пачаць з надвядзеньня некаторых асноўных вынікаў выкананьня пяцігодкі за чатыры гады для таго, каб члены ЦВК маглі ўсьвядоміць, на чым мы грунтуем плян 1933 году — першага году другой пяцігодкі, якія задачы ставяцца перад пляном 1933 году і што мы павінны зрабіць, каб яго выканаць і перавыканаць.

1. Асноўныя вынікі выкананьня пяцігодкі за чатыры гады па Саюзе ССР і па БССР

Ужо з выстарчальнай падрабязнасьцю асьветлены ўсе матар'ялы і факты, якія характарызуюць вынікі выкананьня пяцігодкі за чатыры гады па Саюзе ў цэлым, асабліва грунтоўныя вынікі падведзены ў дакладзе тав. **Сталіна** на апошнім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б). Але для таго, каб адпавядаць у памяці членаў ЦВК БССР факты і вынікі выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, я таксама павінен падаць вам некалькі лічбаў, якія характарызуюць вялізарныя посьпехі выкананьня пяцігодкі за чатыры гады па Саюзе ССР.

Тав. **Сталін** у сваім дакладзе паказаў, што асноўнымі задачамі першай пяцігодкі вызначаліся:

а) перавесьці нашу краіну з яе адсталай, часамі сярэднявяковай тэхнікай, на рэйкі новай сучаснай тэхнікі;

б) ператварыць СССР з краіны аграрнай і пераважна, залежнай ад капрызаў капіталістычных краін, у краіну індустрыяльную і магутную, зусім самастойную і незалежную;

в) выцесьніць да канца капіталістычныя элементы, пашырыць фронт сацыялістычных форм гаспадаркі і стварыць эканамічную базу для вынішчэньня класаў у СССР, для пабудовы сацыялістычнага грамадзтва;

г) стварыць у нашай краіне такую індустрыю, якая была-б здольна пераўзброіць і рэарганізаваць ня толькі прамысловасьць у цэлым, але і транспарт, і сельскую гаспадарку на базе сацыялізму;

д) перавесьці дробную і распыленую сельскую гаспадарку на рэйкі буйной калектыўнай гаспадаркі, забяспечыць тым самым эканамічную базу сацыялізму ў вёсцы і ліквідаваць такім чынам магчымасьць адкрываньня капіталізму ў СССР і

е) стварыць у краіне ўсе неабходныя тэхнічныя і эканамічныя прадпасылкі для максымальнага ўзьдыму абароназдольнасьці краіны, якая дае магчымасьць арганізаваць рашучы адпор усім і ўсякім спробам ваеннай інтэрвэнцыі з-за мяжы.

Грунтуючыся на гэтых генэральных установках першай пяцігодкі, мы ў БССР, калі зацьвярдзілі пяцігодку разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР, таксама ставілі асноўнымі задачамі пяцігодкі:

а) правядзеньне сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі БССР праз рашучую індустрыялізацыю краіны, з павышэньнем адноснай вагі прамысловасьці ў народнай гаспадарцы БССР;

б) скарачэньне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі па шляху не абагуленьня і ўзьдыму сельска-гаспадарчай вытворчасьці;

в) павялічэньне пралетарскага ядра і яго адноснай вагі ва ўсім кіраўніцтве сацыялістычным будаўніцтвам, узмацненьне кіруючай ролі пралетарыяту;

г) павышэньне матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўнага насельніцтва;

д) усебаковае ўзмацненьне і разьвіцьцё сацыялістычных элементаў у народнай гаспадарцы краіны, рашучае і сыстэматычнае сацыялістычнае наступленьне на капіталістычныя элементы гораду і вёскі.

Выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, якое мы цяпер маем, і дасягнутыя вынікі паказваюць, што генэральная лінія партыі зьяўляецца адзінымі шляхам да пабудовы сацыялістычнага грамадзтва.

Як-жа мы на практыцы рэалізавалі гэтыя ўстаноўкі і як выканалі ўсю пяцігодку ў цэлым па Саюзе?

Ужо відома, што па прадукцыі прамысловасьці пяцігодка за чатыры гады па Саюзе выканана на 93,7 проц., а па прадукцыі цяжкай прамысловасьці — на 108 проц. Аб'ём прамысловай прадукцыі супроць даваеннага часу складае 334 проц., гэта значыць павялічыўся больш чым у тры разы.

Вынікі пяцігодкі па БССР

Як пяцігодку за чатыры гады мы выканалі па БССР? Трэба сказаць, што як і ва ўсім Савецкім саюзе ў нас пяцігодка за чатыры гады выканана цалкам, а ў радзе галін і перавыканана. Гэта відаць з наступных фактаў:

па прамысловай прадукцыі пяцігодку мы выканалі ў БССР на 115 проц., прамысловая прадукцыя ў сувязі з гэтым павялічылася супроць 1927-28 г. г. у 4,16 раз і складае ў агульным аб'ёме 852 млн. руб., а супроць даваеннага ўзроўню прадукцыя прамысловасьці павялічылася ў нас у 8 раз.

Па капіталаўкладаньнях у дзяржаўную прамысловасьць і самаркіраваную пяцігодку мы выканалі па 105 проц., а па групе «А» капіталаўкладаньні выкананы на 130,6 проц. (уся сума ўкладаньняў дайшла ў нас да 264 млн. руб. замест вызначаных пяцігодкай 251 млн. руб.). У сувязі з гэтым значна павялічылася ўдзельная вага прамысловай прадукцыі ў адносінах да прадукцыі сельскай гаспадаркі БССР. Пры нязмінным росьце сельскай гаспадаркі зараз ужо прадукцыя прамысловасьці БССР даходзіць прыкладна да 52-53 проц. па сваёй удзельнай базе ў адносінах да прадукцыі сельскай гаспадаркі. У БССР мы таксама пабудавалі за гэтыя чатыры гады значную колькасьць прамысловых прадпрыемстваў; найбольш буйных з іх мы пабудавалі 35 прадпрыемстваў. У сувязі з гэтым рэзка выявіўся характар нашай прамысловасьці ў бок павялічэньня ўдзельнай вагі буйных прадпрыемстваў, якія занялі пануючае становішча ва ўсёй прамысловасьці. Гэта відаць з наступных прыкладаў. Калі ўзяць размер прадпрыемстваў па колькасьці занятых на іх рабочых, дык з пачатку пяцігодкі прадпрыемстваў, на якіх было занята да ста рабочых, у нас было 13,9 проц. ад усяго ліку прадпрыемстваў, а ўжо ў 1932 годзе гэтыя прадпрыемствы знізіліся да 6 проц. Прадпрыемстваў з колькасьцю рабочых да 500 было 43,5 проц., а цяпер — 23,1 проц., з колькасьцю рабочых да адной тысячы чалавек было 19,9 проц., цяпер — 18,6 проц. Затое прадпрыемствы, якія маюць больш тысячы рабочых значна вырасьлі ў сваёй удзельнай вазе, напрыклад, з колькасьцю рабочых да 3-х тысяч чалавек з 22,7 проц. у пачатку пяцігодкі ўзрасьлі да 43,1 проц., а звыш 3-х тысяч чалавек у пачатку пяцігодкі ня было ні аднаго прадпрыемства, цяпер іх ёсьць каля 10 проц.

За першую пяцігодку арганізавана цілы новых відаў вытворчасьці, як напрыклад, сіласарэзкі, бульбасартоўкі, бульбакапалкі, карнарэзкі, сьвідравальныя варштаты, розныя лябёдкі, вальцавыя варштаты, дубільны экстракт, стандартныя дамы і г. д. У 1932 годзе ў нас новыя і рэканструяваныя прадпрыемствы занялі ўжо вялікае месца па валавой прадукцыі. Так, напрыклад, адна толькі Магілёўская фабрыка штучнага валакна дае каля 40 проц. прадукцыі да даваеннай прамысловасьці, якая была ў БССР. У сувязі з тым, што ў дарэвалюцыйнай Беларусі ня было колькі небудзь разьвітой фабрычна - заводзкай прамысловасьці і ў сувязі з вялікім размахам прамысловага будаўніцтва, асабліва ў першую пяцігодку, цяпер ужо ў нас новыя і рэканструяваныя прадпрыемствы пачынаюць адыгрываць вядучую ролю, у сувязі з гэтым на нас укладаюцца і вялікія абавязкі па авалоньні тэхнікі новых прадпрыемстваў.

У нас вырасьлі такія буйныя прадпрыемствы, як Гомельскі, Магілёўскі трубалітэйны завод, Брянскі цэментны завод, Гомельскі шкляны эканамічны завод, Бабруйскі дрэваапрацоўны камбінат, БелДРЭС імя Сталіна і шмат іншых. У сувязі з гэтым значна павялічылася сярэдня-гадавая колькасьць рабочых. Калі ўзяць, напрыклад, увесь наймовы персанал у цэлым, дык у 1927-28 г. ён складаў 244,1 тыс. чалавек. Намячалася пяцігодкай на 1932-33 год 366,3 тыс. чалавек, а фактычна ёсьць 524,2 тыс. чалавек, што да 1927-29 г. складае 217,2 проц. У тым ліку прамысловых рабочых было ў нас з пачатку пяцігодкі 54 тыс., намячалася пяцігодкай на апошні ж год 104,8 тыс. чалавек, а фактычна ёсьць у 1932 годзе 124 тысячы чалавек, або пяцігодка выкананa на 115,3 проц. Будаўнічых рабочых было 26,4 тыс. чалавек, намячалася пяцігодкай 45,1 тыс. чалавек, фактычна ёсьць у 1932 годзе 77,5 тысяч чалавек. Транспартнікаў было 27,7 тысяч чалавек, намячалася да ёсьці да 32,1 тыс. чалавек, фактычна ёсьць 45,2 тыс. чалавек, або пяцігодка выкананa на 140,8 проц.

Такі рост рабочай клясы ў БССР мае для нас вялізарнейшае значэньне з пункту гледжаньня ўзмацненьня кіруючай ролі пралетарыяту ва ўсім гаспадарчым і культурным будаўніцтве БССР, а таксама і па ўзмацненьні кіруючай ролі пралетарыяту ў галіне перабудаваньня сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад.

У гэтую пяцігодку наш Савецкі саюз дабіўся рашаючых посьпехаў і ў галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Так, напрыклад, па Саюзу калектывізавана больш 60 проц. бяднацка - серадняцкіх гаспадарак, якія ахапляюць 75 проц. пасеўнай сялянскай плошчы, арганізавана 5 тыс. саўгасаў.

Такім чынам калгасы і саўгасы разам па Саюзу аб'ядналі каля 80 проц. ўсёй пасеўнай плошчы.

Значна пераўзброена сельская гаспадарка тэхнічнымі сродкамі. За гэтую пяцігодку здана сельскай гаспадарцы больш 120 тыс. новых трактараў і цяпер па Саюзу ёсьць больш 147 тыс. трактараў у сельскай гаспадарцы. Таксама ў сельскую гаспадарку накіравана розных сельска-гаспадарчых машын на суму 1.600 млн. руб., што больш чым у два разы павялічыла машынаўзброенасьць сельскай гаспадаркі ў параўнаньні з 1928 годам.

Уся пасеўная плошча па Саюзу за гэты час павялічылася на 21 млн. гектараў у параўнаньні з плошчай 1927-1928 годам.

Вынікам гэтага зьяўляецца тое, што зараз асноўную ролю ў сельскай гаспадарцы для дзяржавы адыгрываюць арганізаваны сэктар. Гэта дало магчымасьць нашаму Саюзу ашчэ ў 1931-32 годзе загатовіць збожжа 1.400 млн. пудоў замест 700 млн. пудоў, якія сабраны ў 1927-28 г.

Таксама і ў БССР мы маем вялікія дасягненьні ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, напрыклад: калектывізацыяй пад канец 1932 году ахоплена 42 проц. бяднацка - серадняцкіх гаспадарак, якія ахапляюць 51,2 проц. пасеўнай плошчы; арганізавана 429 саўгасаў. Сацыялістычным сэктарам (саўгасы калгасы) ахоплена 56 проц. усёй пасеўнай плошчы.

У нас значна павялічыўся трактарны парк. Напрыклад, з 120 трактараў якія былі ў пачатку пяцігодкі, ён вырас да 2.822 трактараў, або павялічыўся ў 22,9 раз, а магутнасьць трактараў павялічылася з 1.564 конскіх сіл да 31.226, або ў 30 раз. У сувязі з гэтым удзельная вага мэханічнай цягавай сілы ў агульнай цягавай сіле павялічылася з 0,23 проц. да 6,1 проц. МТС, якіх у нас ёсьць у пачатку 1933 году 57, ахапляюць каля 33 проц. пасеўнай плошчы калгасаў.

Узмацнілася машынізацыя сельскай гаспадаркі. Так, напрыклад, колькасьць збожжавых камбайнаў за гэтую пяцігодку павялічылася ў 11,4 раз, сеншаўнікаў — у 8,8 раз, сноапвязалак — у 7,9 раз, жнівярок-самаскідак — у 11,9 раз, бульбакапалак — у 11,8 раз, ільнамялак — у 18,5 раз.

Апрача таго, мы за гэту пяцігодку далі новыя віды сельска-гаспадарчых машын: тукавыя сявалкі, ільнацерабілкі, сіласарэзкі і г. д. Пасеўная плошча ў нас за гэту пяцігодку павялічылася на 15 проц., або на 500 тыс. гектараў.

Рэзка зьмянілася роля сацыялістычнага сэктару ў разьвіцьці жывёлагадоўлі. У 1927-28 годзе ў саўгасах у нас было 4.670 рабочых коняй, у 1932 годзе конскае стада саўгасаў складае 16.800 штук, а да стада 1927-28 году — 360 проц.

Кароў было ў пачатку пяцігодкі 8.975 штук, цяпер іх ужо ёсьць у саўгасах 32,5 тыс. штук, або 362 процанты.

Стада сьвіней у саўгасах складала ў пачатку пяцігодкі 2.491 шт., у 1932 г. было 105 тыс. штук.

У калгасах у 1928 годзе коняй было 4.287, цяпер 357 тысяч; буйнай рагатай жывёлы калгасны сэктар аб'ядноўвае 12.466 штук, цяпер ён яднае 381 тыс. штук; сьвіней было 3.108 штук, цяпер — 130 тысяч.

З гэтага відаць, што роля сацыялістычнага сэктару ў разьвіцьці жывёлагадоўлі зьмянілася ў некалькі дзесяткаў раз і што сацыялістычны сэктар жывёлагадоўлі зьяўляецца падучым сэктарам.

Падводзячы вынікі гаспадарчага будаўніцтва за першую пяцігодку, мы ня можам не адзначыць праробленай работы і ў галіне дарожнага будаўніцтва, а тут мы шмат зрабілі, мы маем вялікія дасягненьні. Так, напрыклад, за апошнія чатыры гады было ўкладзена ў дзяржаўнае і шосавае будаўніцтва 167 млн. руб. і пабудавана 1.463 клм. дарог, пакрытых камеснай вопраткай. Гэта больш чым падвоенае даўжыні шосавых шляхоў, бо да 1929 году ў нас было, уключаючы ўсе шосавыя шляхі старых магістраляй, якія праходзяць праз Беларусь, напрыклад, так званая Варшаўская шаша, шаша Ленінград—Кіеў і г. д. — усяго 1.450 клм.

Гэтыя посьпехі ў дарожным будаўніцтве для БССР маюць выключна важнае эканамічнае значэньне, бо БССР мела шмат непраходных месц, шмат балот і лясоў. Зараз мы далі праежджыя шляхі ва ўсе самыя аддаленьня, тлухія раёны БССР. Гэта ў высокай ступені ўзьмацне нашу эканоміку і культуру, узмацніць сувязь гораду з вёскай, узмацніць кіруючую ролю рабочай клясы ў адносінах да сялянства. І мы зараз ужо можам чуць ад беларускага палескага селяніна, які раней быў адрэзан ад культурных цэнтраў непраходнымі балотамі, што толькі савецкая ўлада дала магчымасьць лепшай сувязі з культурна-гаспадарчымі цэнтрамі. Яны кажуць, што «мы толькі цяпер зразумелі, што азначае пабудаваць шашу, бо гэта эканоміць і цягавую сілу, і сялянскі воз, павялічвае грузазварот і г. д.».

Вось прыкладныя факты выкананьня пяцігодкі за чатыры гады ў галіне прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і транспарту. Я ня буду спыняцца на чыгуначным і водным транспарце. Тут мы таксама маем вялікія дасягненьні.

Магутны ўздым матаряльнага і культурнага ўзроўню працоўных

У выніку ўсяго сказанага пра дасягненьні на гаспадарчым фронце мы дабіліся значнага павышэньня матар'яльнага і культурнага становішча шы розных працоўных мас:

а) сярэдняя гадавая зарплата рабочых і служачых БССР павялічылася на 102 проц., узрасла з 622 руб. у 1928 г. да 1.258 руб. у 1932 годзе. Пяцігодкай намячалася для 1933 году 816 руб. Увесь фонд зарплаты павялічыўся з 152 млн. руб. у 1928 г. да 668,5 млн. руб. у 1932 годзе, або ў 4,4 разы;

б) прамадзкім харчаваньнем ахоплена 265,6 тыс. чалавек або 34,4 проц. усяго гарадзкога насельніцтва, а калі ўзяць рабочых, дык іх ахоплена грамадзкім харчаваньнем 105,6 тысяч чалавек, або 76,3 проц. усіх рабочых.

З паказаных лічбаў відаць, што мы па павышэньні зарплаты цэлем вышэй сярэдняга павышэньня па Саюзу, бо па СССР сярэдня-гадавая зарплата для рабочых і служачых павысілася на 67 проц., таксама і па грамадзкім харчаваньні ў Саюзе рост больш чым на 70 проц. Значыць, мы маем гігантскі рост у разьвіцьці грамадзкага харчаваньня, а гэта мае выключна важнае значэньне. Некаторыя нашы статыстыкі-эканамісты, якія ня зьяўлялі ашчэ з пазыцыі буржуазных эканамістаў, падводзячы вынікі росту матар'яльнага становішча рабочых, прабуюць браць толькі голыя лічбы індывідуальнага снабжэньня, ну, і прыходзяць, вядома, да абсурду. Яны, бачыце, выкідаюць такі, артыкул, як разьвіцьцё грамадзкага харчаваньня і такім чынам робяць памылковыя вывады.

Шмат з прысутных тут старых рабочых ведаюць, як у дарэвалюцыйны час прыходзілася працаваць ім па 12 гадзін пры самых цяжкіх умовах капіталістычнага прадпрыемства, ня маючы нават і кавалка хлеба ў кішэні. Напрыклад, і мне самому прыходзілася працаваць на капальнях і на фабрыках на 12 гадзін, мець толькі 20-30 хвілін перапынку і без абеду, калі захапіў кавалак хлеба ў кішэню, дык перакусіш, а не захапіў, дык і так працуем усе 12 гадзін. А цяпер савецкі рабочы атрымлівае на сваім прадпрыемстве і сьнеданьне, і абед, а дзе пастаўлена добра сталоўка то і добрае сьнеданьне і добры абед, а на шмат іншых прадпрыемствах, дзе ЗРК, адведзены рабочага снабжэньня добра працуюць (а гэтага ў нас таксама ўжо пачала) рабочы цалкам здавальняецца харчаваньнем тут-жа на прадпрыемстве, а ўвесь паёк індывідуальнага снабжэньня цалкам застаецца для сям'і.

І кожны рабочы, асабліва старыя рабочыя, якія прайшлі жудасьці капіталістычных прадпрыемстваў у дарэвалюцыйны час, разумеюць вялікае значэньне заваяваньняў першай пяцігодкі па разьвіцьці грамадзкага харчаваньня, як і наогул павышэньні матар'яльнага забесьпячэньня рабочай клясы.

Таму зусім няправільным зьяўляюцца спробы некаторых людзей з нашых эканом-статыстычных органаў, якія становяцца на шлях сушастаўленьня дабрабыту працоўных мас, толькі шляхам параўнаньня разьмераў індывідуальнага снабжэньня.

Нельга не адзначыць і такую акалічнасьць, што ў сувязі з ліквідацыяй беспрацоўя ў нас, зараз працуюць два-тры чалавекі з аднэй сям'і па заводах і фабрыках і гэтым самым у вялікай ступені павялічваецца дабрабыт усёй рабочай сям'і цалкам.

Як і ў ўсяму Савецкаму саюзу, у нас, у БССР, ашчэ ў 1930 годзе ліквідавана беспрацоўе. У 1931-32 г. у нас ня было ні аднаго беспрацоўнага, больш таго, рад галін народнай гаспадаркі адчуваюць недахоп рабочай сілы. Таму, на першы плян выступілася пытаньне аб лепшай арганізацыі і лепшым наборы рабочай сілы.

А што значыць ліквідацыя беспрацоўя? Гэта вялікая справа для рабочай клясы. Напоўна многія ўдзельнікі гэтай сэсіі перанесьлі на сваёй сыпіне ўсе жудасьці беспрацоўя ў дарэвалюцыйны час, калі па месяцох і гадох шукалі работу і начавалі пад плотам і ня еўшы. Мне самаму прыходзілася, шукаючы работы, ня раз начаваць пад плотам. Калі я заехаў у Крывы Рог шукаць работы ў кішэні было ўсяго тры капейкі грошай (а ў гэты час ашчэ скарачаліся рабочыя, а ня прымаліся), то была толькі адна думка,—як пракарміцца і не па мерці з голаду. Людзі, якія вынесьлі на сабе ўсю жудасьць капіталістычнай вытворчасьці ў дарэвалюцыйны час з яе нямінучым беспрацоўем, разумеюць, што значыць ліквідаваць беспрацоўе. Гэта адно з вялізарнейшых заваяваньняў першай пяцігодкі. Гэта азначае ліквідаваць няўпэўненасьць у заўтрашнім дні, гэта азначае, што наш рабочы ўпэўнен, што ён мае цьвёрдую глебу пад нагамі. Больш таго, наш рабочы ня толькі хапаецца за якую небудзь работу, а ён ашчэ і перабірае работу. У сувязі з недахопам рабочай сілы некаторыя рабочыя імкнуцца перабягаць з аднаго прадпрыемства на другое і справа даходзіць да лятунства.

У вёсцы мы таксама маем рашаючыя дасягненьні ў сэнсе палажэньня бытавых умоў бяднацка-серадняцкіх мас сялянства. Тав. Сталін сказаў, што мы, дзякуючы таму, што ўся бедната ўцягнута ў калгасы, тым самым падарвалі аснову распластаваньня сялянства на бедных і багатых, заможных і незаможных і тым самым ліквідаваны паўпэрэрыў у вёсцы, таксама і няўпэўненасьць бедняка ў заўтрашнім дні. Многім відома, што ў мінулым бедняк-селянін заўсёды думаў аб тым, дзе-б зарабіць кавалак хлеба, пракарміць дзяцей і ня пухнуць з голаду. Цяпер бедняк і серадняк, якія арганізаваліся ў калгасы, упэўнены ў тым, што яны будуць сытыя і хлеба ў калгасе будзе і ён у іх ёсьць.

Для БССР мае вялікае значэньне і такое пытаньне, як ліквідацыя так званай праблемы мястэчка, бо яна ўжо вырашана. Нам усім відома, што БССР была так званай (праклятай па мяці царызму) «мяжой аселасьці». Мястэчкі ў БССР,—гэта мястэчкі яўрэйскай беднаты. Палітычна гэтая «мяжа аселасьці» ўшчэнт разьбіта Кастрычніцкай рэвалюцыяй, пасьля чаго перад савецкай уладай стаяла задача далучэньня мястачковай беднаты да вытворчай работы. Таму, ашчэ ў пачатку першай пяцігодкі мы займаліся пытаньнем гаспадарчага ўзарадкаваньня мястачковай яўрэйскай беднаты і ў нас быў прыняты спэцыяльны плян пераводу мястачковай беднаты на вытворчую работу.

У выніку пераможнага завяршэньня пяцігодкі за чатыры гады, мы цяпер гэтую праблему вырашылі цалкам і поўнасьцю. Цяпер праблема мястэчка, як самастойная праблема зьнята. Яна ўжо вырашана пасьпяховым ходам сацыялістычнага будаўніцтва. Усё працаздольнае насельніцтва мястачковай беднаты і горадоў цалкам і поўнасьцю ўцягнута ў вытворчую работу на прамысловасьці, у сельскай гаспадарцы і сакрамкаапрацыі. Значыць, мы ня толькі палітычна разьбілі ўшчэнт так званую «мяжу аселасьці», а мы ўжо, у выніку пасьпяховага выкананьня пяцігодкі ў асноўным ліквідавалі выпіі «мяжы», выпікі тай царскай палітыкі, якая стварыла «мяжу аселасьці».

Мы таксама ліквідавалі і так званую праблему аграрнага перанасяленьня. Многім членам ЦВК відома, што ні адзін раз, нават і на пасяджэньнях сэсіі гаварылі па пытаньні так званага аграрнага перанасяленьня беларускай вёскі. Цяпер гэта пытаньне зьнята гісторыяй у выніку пераможнага выкананьня першай пяцігодкі. Мы ўжо больш, як два гады не займаемся перасяленьнем беларускага працоўнага сялянства з прычыны зямельнай цеснаты ў іншыя часткі Савецкага саюзу. Аб'яднаньне сельскіх гаспадарак у калгасы і разгортваньне ўсёй вытворчасьці прыяло да таго, што гэтага перасяленьня няма, у той час, калі ашчэ ў пачатку пяцігодкі мы ня раз гаварылі аб зямельнай цеснаце ў беларускай вёсцы. Гэтае пытаньне адпала раз і на заўсёды. Да гэтага трэба дадаць, што ў свой час пацыянал-дэмакраты і прыпэўнаўцы асабліва разгулялі праблему аграрнай перанасяленасьці і пра панавалі шлях яе вырашэньня праз перасяленьне соцень тысяч бяднацка-серадняцкіх малазямельных гаспадарак за межы БССР. Пад гэтым хавалася імкненьне пабольш пакінуць зямлі заможна-кулацкай частцы сялянства. Такая лінія прыпэўнаўчыны выцякала з таго, што яны арыентаваліся на індывідуальна-хутарскую кулацка-заможную вёску, супроць калгаснай вёскі.

Цяпер стаіць другое заданьне—лепш арганізаваць работу калгаснага сялянства, бо ў некаторых калгасах ужо мае месца недахват рабочай сілы для выкананьня тых вялікіх задач па ўзьдыму сельска-гаспадарчай вытворчасьці, якія стаяць перад намі.

Такім чынам, мы пяцігодкай канчаткова вырашылі праблему так званага аграрнага перанасяленьня, ліквідавалі яго і тым самым ліквідавалі спадчыну прыпэўнаўчыны, ня дачыны ладзюмом скапцэнтраваць вялікую колькасьць зямлі ў верхавіны кулацтва беларускай вёскі. Гэтыя два пытаньні, як вырашэньне праблемы мястэчка, далучэньня да вытворчай работы ўсёй мястачковай беднаты і ліквідацыя аграрнай перанаселенасьці маюць вялікае гістарычнае і палітычнае значэньне.

Я напомню членам ЦВК, што, калі ў 1928 годзе Саўнарком Беларусі прыняў спэцыяльную пастанову аб гаспадарчым узарадкаваньні мястэчак, то гэта знайшло свой водгук і за мяжой. Нам «пазайздросьцілі» і тады мы чыталі ў некаторых замежных газэтах пра тое, што і некаторыя капіталістычныя дзяржавы «думалі» пачаць прыспрэйваць яўрэйскую мястачковую беднату на вытворчую работу. Напрыклад, былі запрошаны амэрыканскія міліянэры, якія хацелі аддаць для мэтэрацыі Нішкія балоты для таго, каб арганізаваць там яўрэйскія калёніі для сельска-гаспадарчых работ. Відома, мы і тады ня верылі ў гэту справу і гаварылі, што гэта яўрэйскае духавенства—рабіны, якія зьбіраліся на гэтай прычыне на спэцыяльныя зьезды і запрашалі да помачы іх мэтэрацыі Нішкія балоты, што яны выконваюць заказ імперыялізму і марочаць галаву яўрэйскай беднаце для таго, каб супакоіць росныя абяцанкамі. Ну, і аказалася, што мы мелі рацыю. У той час, калі ня ўсе 100 проц. вырашылі праблему мястэчка і далучылі асноўную масу беднаты да вытворчай работы ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы, у іх да гэтага часу амэрыканскія агенты праводзяць так званыя «посьледы». Калі-ж яны прыступяць да мэтэрацыі—невядома. Доўга давядзецца чакаць яўрэйскай беднаце ад зарубежных дзяржаў гэтага «ратунку». Гэта гаворыць аб тым, што толькі ленінская нацыянальная палітыка, не ажыцьцяўленьне дзяржавай пралетарскай дыктатуры прыводзіць вырашэньню і сацыяльную і нацыянальную праблему і вырашае з вялікім посьпехам.

Мы таксама маем перавыкананьне пяцігодкі і ў галіне товараазвароту як па Саюзу ў цэлым, так і па БССР. Я ня буду агалашаць лічбаў па Саюзу, а скажу толькі, што товараазварот па СССР значна пашырыўся і самае галоўнае гэта тое, што з товараазвароту выціснуты капіталістычныя элементы. Каапэрацыйны і дзяржаўны гандаль зазяляецца цяпер рашаючым зьвяном, пануючым зьвяном у справе товараазвароту.

ПК БССР мы пашырылі гандлёвую сетку з 4.111 адзінак да 7.158 адзінак супроць 4.956 выдзначаных пяцігодкай. У 1928 годзе товараазварот арганізаванага сэктару склаў 191 млн. рублёў, а ў 1932 годзе 762 млн. рублёў супроць 444 млн. намечаных па пляну. У нас таксама выціснуты капіталістычныя элементы са сферы товараазвароту.

БССР надзейны сталёвы фарпост вялікага Савецкага саюзу

Вялікія дасягненьні мы маем у выніку выкананьня пяцігодкі і па разьвіцьці культуры. Прычым на гэтым вучастку мы маем большае перавыкананьне пяцігодкі, чым па Саюзу ў цэлым. Мы амаль поўнасьцю ліквідавалі няпісьменнасьць у вёсцы да 45 год, а ў горадзе да 50 год. Калі ўзяць насельніцтва ад 10 да 15 год, то ў 1926 годзе ў нас было пісьменных 65,6 проц., а ў 1932 г.—усе 100 проц., ад 16 да 50 год у 1926 г. было ўсяго—57 проц. пісьменных, а ў 1932 г.—98 проц. Мы ўвялі ўсеагульнае абавязковае навучаньне на базе чатырохгодкі. У 1933 году мы ўводзім усеагульнае навучаньне на базе сямігодкі. Часткова яго ўвялі ашчэ ў 1932 г. І гэтае мерапрыемства ў нас у асноўным забясьпечана сродкамі з дзяржаўнага бюджэту. У вялікіх размерах пашырылася сярэдняя і вышэйшая асьвета. Навукова-дасьледчых установаў (уключаючы і дасьледчыя станцыі), у 1926 г. у нас была 21 адзінка, у 1932 г. іх ужо 47. Навуковых працаўнікоў у 1928 г. было 745, цяпер 962, у тым ліку пашыраюцца кадры навуковых работнікаў з карэнніка на сельніцтва, што асабліва мае важнае значэньне, бо ў нас культурных сіл было мала. Гэта відаць з таго, што навуковыя работнікі па нацыянальнасьці беларусы сярод усіх навуковых работнікаў складаюць 49,6 проц. Так сама значна пашырылася сетка і вышэйшых навучальных устаноў і вышэйшых тэхнічных устаноў. Значна пашырылася мастацтва. Дарэчы кажучы, неабходна ўспомніць такую акалічнасьць. Пасьля майго дакладу аб першай пяцігодцы на Усебеларускім зьезьдзе саветаў і пасьля абгаворэньня саюзнай пяцігодкі на зьезьдзе саветаў Саюзу ССР, даклад аб якой зрабіў тав. Крыкжаноўскі, некаторыя белагвардзейскія газэты у Варшаве пісалі цэлыя памфлеты, дзе сьмяяліся і маё прозьвішча. Яны пісалі, што Крыкжаноўскі лётае ў павэтры і хоча злавіць жураўля ў небе, і што, моў, лепш было-б навучыцца ў Галадзеда (яны тады ня называлі старшынёй ЦВК БССР, але ня ў гэтым справа), які думае злавіць хоць сініцу ў рукі, бо ён думае ў Менску пабудаваць беларускую кансэрваторыю. Гэтымі днямі яны высьмейвалі пяцігодку Савецкага саюзу і пяцігодку БССР. А вось вынікі гавораць, што сьмеемся мы, а не яны. Мы такі кансэрваторы пабудавалі, як і пабудавалі тысячы новых фабрык-гігантаў сучаснай індустрыі, таксама рэарганізавалі сельскую гаспадарку на калгасны лад. Такім чынам мы ня толькі сініцу, але і жураўля па-сапраўднаму злавілі, а яны гэтыя—адкіды капіталістычнай грамады, якія эмігравалі за мяжу, і да гэтага часу выціраюць закуткі эўрапейскіх кабакоў і шынкоў і салёны некаторых відомых сапоўнікаў. Значыць, правільная тая прыказка, якая гаворыць, што «сьмяецца той, хто сьмяецца апошнім».

У нас за пяцігодку значна пашырылася справа разьвіцьця другу. Напрыклад, тыраж кніжнай прадукцыі выканан супроць пазначэньня пяцігодкі на 116 проц., па часопісах—пяцігодка выканана на 130 проц., па газэтнай прадукцыі—на 175 проц. Важнейшым дасягненьнем зьяўляецца тое, што мы здолелі ўстанавіць кожнаму рабочаму сваю газэту. Гэта вялікае дасягненьне на культурна-палітычным фронце, бо нашы рабочыя партыйныя і савецкія арганізацыі

(Працяг на 3 стар.)

Працяг дакладу тав. ГАЛАДЗЕДА

лаюць магчымасьць узмацніць сваё кіраўніцтва, маючы ў сябе газэту, як важнейшую зброю друкаванага слова ў руках пралетарскай дыктатуры.

Вось асноўныя факты, якія сьведчаць аб пасьпяховым выкананьні пяцігодкі за чатыры гады як па ўсяму Саюзу, так і па БССР. Яны сьведчаць аб тых вялікіх перамогах, якіх дабілася камуністычная партыя і ўся рабочая клясa пад яе кіраўніцтвам.

Нашы посьпехі па выкананьні пяцігодкі за чатыры гады паказваюць, як аб гэтым гаварыў тав. Сталін і запісана ў пастанове пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), што ў выніку палітыкі індустрыялізацыі СССР з адсталай дробна-сялянскай краіны, якой была старая Расія, высунуўся ў першыя рады найбольш развітых у тэхніка-эканамічных адносінах краін.

У выніку пасьпяховага ажыцьцяўленьня пяцігодкі мы ўжо выканалі ў асноўным яе галоўную задачу—падвялічаньне базы новай сучаснай тэхнікі пад прамысловасьць, транспарт, сельскую гаспадарку, і што СССР з краіны аграрнай ператварыўся ў магутную індустрыяльную краіну, што ўмацніла яго эканамічную незалежнасьць, бо СССР атрымаў магчымасьць рашаючую частку необходнага абсталяваньня вырабляць на сваіх уласных прадпрыемствах.

Апрача гэтага, наш Савецкі саюз ператварыўся ў магутную дзяржаву ў сэнсе абароназдольнасьці, у дзяржаву здольную вырабляць у масавым маштабе ўсе сучасныя сродкі абароны і ўзброіць імі сваю рабоча-сялянскую Чырвоную армію, у выпадку нападу на нас звонку.

Капіталістычныя элементы выціснуты з прамысловасьці капчаткова і безваротна, а сацыялістычная форма стала адзінай формай індустрыі ў Саюзе ССР.

Хуткі рост індустрыі з аднаго боку і пасьпяховае праведзеньне палітыкі ліквідацыі кулацтва як клясы з другога, далі магчымасьць забясьпечыць сельскую гаспадарку трактарамі і павейнымі с.-г. машынамі, аб'яднаць дробныя аднаасобныя сялянскія гаспадаркі ў буйныя калгасныя гаспадаркі і арганізаваць сетку збожжавых і жывёлагадоўчых савецкіх гаспадарак.

Разгромлена кулацтва, падарваны карэньні капіталізму ў сельскай гаспадарцы і тым самым забясьпечана перамога сацыялізму ў вёсцы, а калгасная гаспадарка ператварылася ў моцную апору сацыялістычнага будаўніцтва. Такім чынам СССР ператварыўся ў краіну самага буйнога земляробства.

Посьпехі індустрыялізацыі і рост калгаснага будаўніцтва ўзмацнілі вытворчую эмулку рабочай клясы з калгаснымі сялянствам і канчаткова зацьвердзілі яе ў якасьці асноўнай формы змычкі гораду і вёскі. У сувязі з гэтым і гандлёвую форму змычкі мы ўзялі на новую, больш высокую ступень, на такую ступень савецкага гандлю, калі забясьпечана як ў горадзе, так і ў вёсцы пануючае становішча дзяржаўна-кааперацыйнага, а таксама і калгаснага гандлю і праводзіцца сыстэматычная барацьба за выкараненьне спэкуляцыі з гандлю.

На аснове ўсіх гэтых вялізарных дасягненьняў СССР—магутнага росту сацыялізму ў нашай краіне і дзякуючы ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі, БССР, як складная часта СССР, пры штодзённай і сыстэматычнай дапамозе Савецкага саюзу ператварылася з адсталай разбуранай акраіны былой царскай імпэрыі ў рэспубліку буйных сацыялістычных фабрык і заводаў, у рэспубліку буйнага сацыялістычнага земляробства, у рэспубліку суцэльнай пісьменнасьці і хутка растучай культуры нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьмесьце. БССР ператварылася ў надзейны сталёвы форпост вялікага Савецкага саюзу.

(Працяг у наступным нумары).

Прамова старшыні ЦКК і наркома РСІ БССР тав. ЛЫЧОВА на IV сэсіі ЦВК БССР

Я ня думаю, каб сярод членаў сэсіі, дзесьцінкаў даклада пасьдзяньня знайшоўся хоць-бы адзін чалавек, які-б усумніўся ў посьпехах, дасягнутых ці ў першую пяцігодку. У іх ужо зараз не сумняваецца большая частка цьвердалобай буржуазіі, якая зусім яснa ўпэўнілася і пераканалася ў тым, што гэтыя посьпехі зьяўляюцца сусьветнымі посьпехамі пралетарыяту нашай краіны, што яны зьяўляюцца бязумоўна ўказаньнямі, і таму на зьбіраюся спыняцца на іх доказах. Аб іх вельмі выразна і красамоўна гаварылі т. т. **Галадзед і Пятровіч.** Я, ня спыняючыся на гэтых посьпехах, хачу на сэсіі даць бальшавіцкую крытыку тых недахопаў, якія мелі месца ў гэтай вялікай рабоце. Нягай таварышы мяне не асудзяць за тое, што я буду больш усяго гаварыць пра тэты бок работы, бо без крытыкі і самакрытыкі, якая павінна быць на кожным нашым сходзе і асабліва на сэсіі ЦВК, мы далёка ня пойдзем.

Дазвольце продэманстраваць некалькі ўказаў нашых недахопаў перад сэсіяй ЦВК для таго, каб у дапайшай на шай рабоце іх зьнішчыць і не паўтараць.

Тав. **Ленін** ня раз гаварыў нам аб тым, што мы павінны весьці акуратна і добрасумленна разлунак грошай, што мы павінны распаўзьрыць эканомна, не дазваляцца, не красьці, захоўваць справэйшую дысцыпліну ў працы. Мы за гэты дэзуміг змагаліся і будзем змагацца.

І тав. **Сталін** у сваёй прамове на пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) гаварыў аб тым, што «ў пэрыяд першай пяцігодкі мы змагалі арганізаваць энтузіязм, пафас **новага будаўніцтва** і дабіліся ра шучых посьпехаў. Гэта,—гаворыць ён,—вельмі добра, але цяпер гэтага невыстарчальна, зараз мы павінны дапоўніць яго энтузіязмам, пафасам **асваеньня** новых заводаў, новай тэхнікі, сур'ёзным узьвышэньцем працоўнай дысцыпліны, сур'ёзным скарачэньнем сабекошту. У гэтым зараз галоўнае». Але ня гэтага шмат хто з кіраўнікоў гаспадарчых арганізацый не зразумеў і па гэтым я опынюся.

У 1933 г. паводле пляну мы павінны асвоіць 257,8 млн. рублёў капіталаўкладаньняў у БССР супроць 258 млн. у 1932 г. Мы павінны дабіцца таго, каб зьнізіць сабекошт продукцыі на 15 проц., мы павінны ўзьвесьці продукцыйнасьць працы на 14 проц. у параўнаньні з 1932 г. Вось задачы, якія стаяць перад намі, і для таго, каб іх выканаць, нам трэба ведаць, у чым былі нашы недахопы ў 1932 г.

Дазвольце прывесьці некаторую характарыстыку гэтых недахопаў.

Паводле пляну, фінансаваньне капіталаўкладаньняў па лініі Прамбанку намячалася ў 1932 г. у 35.577.000 руб. і што-ж аказалася? Нашы гаспадарчыя органы на працягу гэтага часу асвоілі ўсяго 27,585 тыс. руб., т. зн. 77,5 проц. па асноўных галінах прамысловасьці. Так: Наркамцяжпрам асвоіў 16.177 тыс. руб. з 20.600 тыс. руб. асьвянованых, т. зн. усяго 81 проц. асваеньня гэтага капіталу. Па Наркамлёгпраме з 9.870 тыс. руб. асвоена 6.618 тыс. руб., г. зн. 66 проц.

Я ня буду гаварыць аб радзе іншых гаспадарчых органаў, у рабоце якіх так сама ёсьць вялікія недахопы. Яны не зьмаглі асвоіць тых капіталаў, якія былі ім прызначаны. Пры зацьвярджэньні памяркоўнуў на 1933 г. гаспадарчыя работнікі будуць, напэўна, выступаць і будуць прасіць вэсію паказаньнь ім сродкі на капіталаўкладаньні. А вось малюнак, як яны змаглі справіцца з тымі капіталаўкладаньнямі, якія былі ім даны ў 1932 годзе.

Многія таварышы забываюць, што справа зусім ня ў тым, каб многа адпусьціць сродкаў той ці іншай галіне гаспадаркі, справа ня ў тым, каб прадугледзець плянам тыя ці іншыя меры прыемствы, а справа ў тым, каб умела падыйсьці да правядзьцьця і пачаць асваеньня тых сум, якія запрадкаваны плянам, каб умела і правільна арганізаваць работу, а найменшыя затраты выкананць вытворчыя мерапрыемствы. Правядзеньне гэтых мерапрыемстваў патрабуе ад усіх нас узмацненьня клясавай, партыйнай пільнасьці.

Па фінансаваньні торфаразьбычы ў нас таксама намячалася па Прамбанку 6.224 тыс. руб., а фактычна асвоена 5.813 тыс. руб. Праўда, тут 93 проц. асваеньня, але калі мы паглядзім, як асвоены гэтыя сродкі, то аказваецца, што некаторыя заводы, затрацілі гэтыя сродкі амаль на 100 проц., сваю вытворчую праграму выканалі на 33,8 проц., а некаторыя ад 26 проц. тапчаваліся і датачтаваліся да 43 проц.? Агульная праграма па торфараспрацоўках адстала. Гэта вусім не гаворыць аб тым, што ў нас ня было магчымасьці выканаць гэту праграму. Пры тым напоры, які зрабіў НК РСІ ў адносінах да торфараспрацовак, мы змаглі за апошнія месяцы работу па торфе значна ажывіць і праграму замест 33 проц. давялі да 54,5, а месяцамі і да 66 проц. Тут відаочна, што магчымасьць для выкананьня пляну была, але гэта магчымасьць нашымі гаспадарнікамі па торфе не скарыстана. Тут вось высуніў адзін з таварышоў на торфе і вельмі скарджыўся на тое, што ім мала сродкаў даюць, а на справе яны лепш гэтых сродкаў ня здолелі скарыстаць як сьлед. Разам з гэтым трэба адзначыць, што хаця мы ў канцы году дасягнулі некаторага ўзьнімцця гэмпаў па распрацоўцы торфу, аднак маем недапушчальнае становішча са зьнижэньнем сабекошту: сабекошт вырас на 4 р. 32 к. на адну тону—па мацьнна-фармаванным торфе і на 4,73—па фрэзэрным торфе.

Вось вам паказальнікі нашай гаспадарчай работы па торфе.

У галіне прамысловасьці буймагар'ялаў у 1932 г., паводле пляну, па лініі Прамбанку прадугледжвалася 6.365 тыс. руб., а скарыстана на працягу году 3.964 тыс. руб. Побач з гэтым трэба з усёй рашучасьцю адзначыць, што нашы гаспадарчыя арганізацыі зусім не ацэньвалі скарыстоўваць тыя вялізарныя магчымасьці, якія мы маем у галіне вырабу новых матар'ялаў. Мы маем зусім нязначны процант выкананьня праграмы па вырабе новых буймагар'ялаў, аб гэтым гаварыць такія лічбы: па шаліне—41 проц., па чарапіцы—17,9 проц., па цэгле—24,8 проц.

Вось як працавала наша прамысловасьць па новых будматар'ялах. Вельмі дрэнна. Тут трэба бутэ прыняць усе меры для таго, каб яна выкарыстала; шкіхі да гэтага выкарыстаньня базумоў на былі і ёсьць. Калі наваліліся на гэту прамысловасьць як сьлед усім сазім цяжарам органы НК-РСІ па ўсіх лініях, дык аказалася магчымым больш як на 16 млн. павялічыць выраб тэтых на працягу 1 з пал.—2 месяцы. Такім чынам ад работы нашай прамысловасьці вельмі многа залежыць.

Па капіталаўкладаньнях. У новым бу дзяўніцтве 1932 г. выдзелен рад фактаў, асабліва ў частцы разбазарваньня даравальных сродкаў. Асобныя новыя будоўлі гадзе перастуцілі ў выдатках пладзе намячальнае і тым самым сарвалі плян. За 9 месяцаў плян па новых будоўлях быў выкананы толькі на 45,9 проц. Пытаньне сабекошту будаўніцтва бязумоўна заслугоўвае асаблівай увагі сэсіі ЦВК.

Тут гаварыў тав. **Сапрыцкі** аб гордасьці Маклеву—трубалітэйным заводзе, але ён не сказаў аб адным—колькі каштуе гэта гордасьць. У гэты завод ужо ўкладзена 4 млн. руб., а тав. Сапрыцкі просіць яшчэ 800 тыс. руб. Вось як мы ўмеем берагчы дзяржаўную капейку, вось як мы аказываем на дзеяньні тав. Леніна аб эканомніі нашага савецкага рубля!

Я мог-бы нам назваць дзесяткі вельмі цікавых прыкладаў, асабліва пра адмаўлі так на апошнае работай сілы, выдаткі на транспарту і інш. Паньшэньне суп роць норм накладных выдаткаў на капітальным будаўніцтве складае 70—80 проц. Такім чынам, устаноўленыя лічбы аказаліся перакрытымі на 30 проц.

Вось малюнкі па гэтай галіне працы.

Дазвольце ў некалькіх словах спынір на на тым, як стаіць у нас справа ў **сельскай гаспадарцы.** Тав. Галадзед ужо гаварыў, што ў нас вылучен цэлы рад шкодніцкіх установак і шкодніцтва ў Наркамземе для яго сыстэме. На капіта лаўкладаньнях у сельскую гаспадарку мы сярэдні павялічваем кожны год: калі ў 1928 г. мы ўклалі ўсяго 21,3 млн. руб., дык у 1933 г. паводле пляну, які тут быў дакладзен, мы выдаткуем 46,822 тыс. руб. Матар'ялы нашых сгранаў—НК-РСІ—паказваюць тымчасам наступнае: у 1932 г. вялмельная калгасная сыстэма не змагла асвоіць усіх ад пушчаных ёй дзяржаўкі сродкаў, у прыватнасьці, плян крэдытаваньня калгасаў быў намечан у 15.128,9 тыс. руб., асвоена-ж толькі 75,5 проц., г. зн. 11 424 тыс. руб. З іх па МТФ скарыстана ўсяго 72,1 проц., па сьвінаводзтвы—71,6 проц., па авіцэнтры—77,2 проц., па трусагадоўлі скарыстана только 41 проц. адпушчаных сродкаў. Гэта здарэцца таму, што плян, які павінны быць спатнаны своечасова і на ліх павінны працавацьі нашы спэцы, аб якіх я казаў гаворыў, ня былі спушчаны на месцы своечасова. Планы спаўзаліся на палавіны месяцы. Больш таго, былі выпадкі, калі плян спушчаны, але нашы гаспадарнікі на месцах так шпарка не развярэтвавацца, каб гэтыя планы правядзіць у жыцьцё. Зараз створаецца яўная пагроза, што плянавая намячаная па кредытаваньні сельскай гаспадаркі ў першым квартале г. г. ня будзець поўнасьцю выкананы, бо ўжо 9-га лютага, а плян па сельскай гаспадарцы яшчэ не (дай шоў да банкаў. Банкі маюць сродкаў больш 2 млн. на 1 квартал, у чым ніку на ремонт сельска-гаспадарчага інвэнтар ву, але гэтыя сродкі з банкаў ня узяты, бо выдатарча-фінансавыя планы на гэту мэту ў цэлым радзе месц яшчэ не складзены.

І сёлета мы маем поўную непаваротлівасьць нашых пэнтраў і нашых органаў на месцах у сэнсе спарыстаньня тых сродкаў, якія выдзелены для гэтай справы.

Некалькі слоў наконт пляканаваньня нашай сельскай гаспадаркі. Тут я дазволю сабе проста сказаць, што ў нас у некаторых выпадках не пляканаваньне сельскай гаспадаркі, а проста гора-пляканаваньне.

Асабліва гэта відаць па прыкладзе арганізацыі фэрм у радзе раёнаў у мінулым годзе: сьвінагадоўчыя, малочныя фэрмы і т. д. Возьмем для прыкладу Дзяржынскі раён. Пры пляканасьці там 117 калгасаў дэталёвай вясной было намечана арганізаваць 117 розных фэрм. У гэтым-жа Дзяржынскім раёне, калгасу «Камунар» далі заданьне арганізаваць: малочную фэрму, садова-гародную фэрму, пчалярную фэрму, насеннаводную фэрму і бульбяную фэрму. Даць аднаму калгасу арганізаваць столькі фэрм—гэта проста ацдзек з пляну. Пляканаваньне ў далейшай нашай рабоце зьяўляецца важнейшым пытаньнем, трэба будзе ва што-б там ні стала паладзіць сапраўднае пляканаваньне нашай сельскай гаспадаркі.

Пытаньне **барацьбы за эканомію ўнутры-прамысловага накапленьня** ня вынімаецца з парадку дня. Унутранае накапленьне на нашых фабрыках і заводах, паводле матар'ялаў нашай праверкі, праходзіла і праходзіць архідрэнна. Мы маем вялізарнейшыя запасы ўнутраных рэсурсаў, якія маглі-б быць скарыстаны, калі-б мы да гэтай справы польшлі сапраўды па-бальшавіцку.

Пытаньне наконт гаспадарчага разрахунку. Аб гасп. разрахунку мы шмат гаворым, аб арганізацыі гаспадарча-разрахунковых брыгад таксама шмат гаварылася і гаворыцца, але барацьба за гэты брыгады ў нашай прамысловасьці відоцца яшчэ недастатковаю. Больш таго, гаспадарча-разрахунковыя брыгады і гаспадарчы разрахунак пастуцілі ідзе па нахільнай роўніцы ўніз, аб гэтым сэсіі ЦВК павінна быць вядома. Калі ў чэрвені было ахоплена гаспадарчым разрахункам 28,8 проц. рабочых, дык у лістападі засталося толькі 25,2 проц., а ў жніўні—22,9 проц. Калі мы паглядзім на асобных наркаматах, дык выявіцца, што ў Наркамцяжпраме ў тым-ж самым месяцы было 35, потым стала 31, а потым 24,5; па **Наркамлёг праме** было 30,5, потым 24,5, а потым зышло на 24. Сярэдні процант ахопу сьцьлепкай працай у нас складае ўсяго толькі 68,2. Вось вам малюнак таго, як мы змагаемся за ажыцьцяўленьне гасп. разрахунку, за ўзмацненьне гаспадарча-разрахунковых брыгад і г. д. Тут мы маем прарыў, які павінен быць запоўнен ў найкарацейшы час.

Наконт фондаў заработнай платы. Мы тут маем недапушчальнае становішча. Перавыдатаваньне фондаў заработнай платы за 1932 г. па сыстэмах 4-х наркамат ваў складае 6 млн. 733 тыс. руб. Гэта калізэйнейшая сума, на гэту суму можна было набудаваць рад заводаў. Па мэтэдзе правяраваньня перавы ліраваньне складае 527 тыс. руб.; па НК-Лёгпраме—2 млн. 598 тыс. руб.; па НК-Шкпраме—587 тыс. руб. Гэтыя лічбы гавораць аб грубейшых парушэньні на ных пляновых памяркоўнасьцяў. Мы маем такія факты, калі расцэнкі на апошнае выдзельных работ павышаюцца ад 80 да 500 проц. звыш нормы.

Возьмеце нашу Менскую ТЭЦ: клад ка цэлы абыйшлася замест 8 р. 70 к. за тысячу—12 руб.; кладка лячэй замест 16 р. 80 к. за кожную—30 руб. Гэта завецца «патанцэньнем» сабекошту будаўніцтва! А вось на фабрыцы «Герой працы» сапраўды па-«героўску» зы рашылі гэту праблему. Тут існуе такое становішча: мала таго, што яны маюць шмат лішняй рабочай сілы, але за 9 мс сцаў абнулага тоды яны перавыдатка валі 630 тыс. руб. і плян сарвалі. Калі ўзець па БССР у цэлым, дык па гэтым артыкуле мы перавыдатковалі 10 млн. руб.

Некалькі слоў наконт рэжыму эканоміі. Пытаньне аб правядзеньні самага строгага рэжыму эканоміі ў нас стаіць і будзе стаяць з усёй сур'ёзнасьцю на ўсім працягу нашага будаўніцтва. Нель та сьпічаць, што мы гэта робім толькі ў гэтым годзе, што ў будучым гэтага ня будзе.

Што-ж мы зрабілі, каб выканаць гэту важную дырэктыву партыі? Мы правялі некаторую падчыстку нашага апарату, які разбух настолькі, што мы павінны былі зрэзаць, так, што ў сэнсе скарачэньня апарату выканаем дырэктыву партыі ў 3-х лішнім фазы. Па 257 цэнтральных установах мы зрэзалі 4.815 адзінак. Мы скарацілі 21 прадпрыяцтва і па заснаўшым сы 31 прадпрыяцтве мы звольнілі 780 адзінак. Гэта дало нам магчы масьць зарадзь больш 15 млн. руб. аб скарачэньнем фондаў зарплаты ў наш бюджэт, які вы будзеце прымаць. Гэта частка нашых унутраных рэсурсаў. А калі ўзець усе іншыя выдаткі, зьвя ленасьці з утрыманьнем лішніх людзей, дык гэта складзе трыдцаць зьвыш 20 млн. руб. эканоміі. Але гэта дасьць на ўзмацненьні. Характэрна, што тыя та варышы, якія нас суправаджаюць у пітьні, зараз скажуць: «добра, больш лёгка зараз стала працаваць». І сапраўды лепш набудзець лішнюю фабрыку, чым трымаць лішніх людзей, якія ляжуць пацэру.

У пэрыфэрыйнай стадыі, калі мы падыйшлі да нашых установ, якія вельмі добра расьсьлёзы і лічаць, што яны працуюць добра, нам проста залуплялі: «Хто даў вам права нас скарачаць?» Так заявіў Фрыд з Сампрамсаюзу. Або такая заява: «Інжынэры і тэхнікі скарачэньню не падлягаюць». Гэта заявіў нам У РИГАРОЎСКІ (як бацькам мы для інжынэраў работы ня знойдзем). Кіраўніцтва Бесканторы Дзяржбанку проста настаяла пытаньне, што скарачэньне іх не датычыць. Мы бачым можна па гэта адшасьцем чынам рэакцыі і падыйшлі да гэтай установы як належыць, значна яе скарацілі і за гэта яны лічаць, што нічога, добра моя на працаваць.

Яшчэ адно пытаньне—гэта раскраданьне дзяржаўных сродкаў, ня лічачы перавыдатка ваньня. У нас за апошні час выявіліся літаральна непрадугледлівыя рэчы такога парадку, што ў апаратах некаторых установ заводзілі ся тэхніка людзі, якім партыя і ўрад даверылі, і якія літаральна на кожным кроку рабілі ня толькі контр-рэвалюцыйную справу, але і ў вялізарных сумах раскрадалі дзяржаўную маемасьць і псавалі яе.

Два-тры характэрныя моманты я нашмон тут асьвятлюць. Возьмем заседжаны гандаль. Там мы выкрылі адзінаго грамадзяніна, аб якім пісалі ўжо ў газэце «Правда», па прозьвішчы Мілер—дырэктар Саюзпушніны, які, атрымліваючы 450 руб. асноўнай зарплаты, умудрыўся набудаваць апарат так, што ў адной установе аказаліся з прэсты і дырэктарам кожнага з іх быў той-жа Мілер, які такім чынам атрымліваў 1.600 руб. у месяц. Будучы дырэктарам трусагадоўчага сэкстару, ён ні разу ня быў у трусагадоўчым сэктасе, тут-жа пад бокам, каля Менску, дзе пад яго кіраўніцтвам запубліена 11.000 трусаў. Тут бязумоўна ёсьць віна і цаных партыйных і прафэсыянальных арганізацый, якія дрэнна сачылі за гэтым.

Другі прыклад: у нас ёсьць так званае кіраўніцтва Т-О, на чале гэтага Т-О стаіць нейкі **Аварын**—з арданамі, заслужаны чалавек, добры вояка, але ён аказаўся такім распрадальнікам, якога доўга не маглі распазнаць і толькі цяпер бокае ўскрыцьцё ўсёй справы паказала, што тут замест кіраўніцтва Т-О была банда раскрадальнікаў, якія ўкралі не адну тысячу рублёў.

Вось яшчэ адзін прыклад. У Менску быў арганізаваны спэцыяльны магазын для ўдарнікаў—рабочых. Праз гэты магазын сбыта прайшло тавараў на міль ён руб. па льгодных цэнах. Замест таго, каб забясьпечваць ударнікаў, людзі забясьпечвалі спэкулянтаў, якія прадавалі гэтыя тавары па спэкуляцыйных цэнах на рынку, і больш чым 1-3 усіх кантрольных гэтага магазыну трапілі на рынак, мала рабочага забясьпечвалі ня. Партыя і ўрад гавораць аб тым, як бы лепш выкрыць ударныя групы, як бы лепш іх забясьпечыць, каб энтузіязм рабочых падмацаваць матар'яльным кантрольнасьцямі і каб яны і надалей маглі таміні-ж тэмпамі працаваць. Прафсаюзы літаральна прамаргалі гэту справу, ня ведалі, што робіцца ў гэтым магазыне, куды і калі даюцца тавары. Толькі сілами РСІ удалося ўскрыць гэтыя зьлоўнасьці.

Я думаю, вы ўсе разумееце, што на па задача зараз—узмацніць увагу да правільнага выдаткаваньня дзяржаўных сродкаў, правільнага іх асваеньня з тым, каб дзяржаўныя сродкі трапілі на тую справу, на якую яны прызначаны. Я лічу сваім бязумоўным абавязкам заклікаць сэсію ЦВК, каб пры ажыцьцяўленьні нашых планаў, якія мы будзем тут зацьвярджаць, мы ўсе сапраўды за правільным, эфэктыўным, эканомным і бязумоўна якасным і ажыцьцяўленым.

Апошнае пытаньне — гэта пытаньне аб **кааперацыі.** Я думаю, што тыя дырэктывы партыі і ўраду, якія былі даны накоп паляпшэньня работы кааперацыі, павінны быць нам ва што-б там ні стала ажыцьцёўлены.

Выкарыстоўваньне ўсіх відаў праяўленьня наймянскага духу, рашучая барацьба са спэкуляцыяй, удзуваньнем цэн, растратамі, самаснабжэньнем і раскраданьнем у гандлёвым апараце — вось што зьяўляецца зараз адзей з асноўных задач партыйных і савецкіх арганізацый. Аб гэтым гаварыў і вераснёўскі пленум ЦК УсеКП(б).

Аднак, правяраючы гэтыя дырэктывы, мы сустрэліся з такімі справамі, якія бязумоўна заслугоўваюць увагі самай шырокай пралетарскай грамадзянасьці. Мы толькі што гэтымі днямі ў нас, у РСІ, разглядалі справу кааперацыі, якая за тры кварталы 1932 году перавыдатковала 11.706 тыс. р. на выплату зарплаты, транспарту і іншыя выдаткі. Сярэдні пайшлі выш плану на тое, што не меркавалася, па тое, што катэгарычна забаранялася, а ў гэты-ж самы час плян таваразвароту выкананы ўсяго толькі на 85 проц. Выдаткі звароту па тавараправодзячай сетцы ня толькі ня зьнижаюцца, але кожны месяц, з кварталу ў квартал, павышаюцца і маюць тэндэнцыю да павялічэньня. Возьмем, напрыклад, некалькі ЗРК: ЗРК «Пралетары» у 3-м квартале выдаткі звароту дасягаюць да 11,8 проц. замест плянавых 7,6 проц., па Менскім ЦРК за першае паўгодзьдзе выдаткі складаюць 11,0 проц. замест плянавых 9,9 проц., па Гомельскім ЦРК у 3 квартале — 13,7 проц. пры плянавых 11,3 проц. Белкаапэраціў апрача таго, што яўна перавысіў выдаткі, яшчэ яшчэ сёе-тое і «навыць», і досыць моцна, больш чым яму паказвалі партыя і ўрад. Па ўсёй сыстэме Белкаапэраціву быў вызначан паводле пляну 1932 г. спрадні прыбытак у 11,6 проц. да звароту. Аднак, за першае паўгодзьдзе Белкаапэраціў меў 3,7 проц., а за 3 кварталы (ён гэтым ня задаволіўся) атрымаў 4,9 проц.

Усё гэта бязумоўна кладзецца на бюджэт рабочага. Іншымі словамі, мы ўстанаўляем пэўную стаўку рабочым, з гэтых ставак устанаўляем пэўны бюджэт, а гэты бюджэт літаральна зрываецца нашай кааперацыйнай сыстэмай, на гледзячы на катэгарычныя ўказаньні партыі і ўраду аб тым, каб гэтага ня было. Апрача таго, мы маем на 1 кастрычніка 1932 г. па сыстэме спажывецкай кааперацыі 1.247 тыс. растрачаных і раскрадзеных грошай «працаўнікамі» кааперацыі. Вось гэта называецца выкананьнем дырэктывы партыі аб барацьбе з раскраданьнямі, аб барацьбе з лішнім накладаньнем, аб барацьбе з непманскім духам! Гэта гаворыць аб тым, што гэта барацьба не вялася, або яна вялася вельмі слаба.

Вядома, нельга абвінавачваць толькі Белкаапэраціў. Навакол Белкаапэраціву ў нас ёсьць цэлы рад грамадзкіх, партыйных, прафэсыянальных арганізацый. А што яны робяць, або што рабілі гэтыя арганізацыі, якія закліканы кантраляваць і гандзець за тым, каб спажывкааперацыя не рабіла лішніх накладаньняў? Вось я назаву прыкладна 5 такіх арганізацый. Скажам Дзяржбанк, які павінен кредытаваць паводле пляну. А што ён зрабіў? Ці сказаў хоць адзін раз Дзяржбанк кааператарам, што ён іх па можа кредытаваць таму, што яны бяруць зьвыш пляну? Не сказаў. Прайшоў год. Дзяржбанк прамаўчаў. Мы лічым, што Дзяржбанк тут ня выканаў дырэктывы партыі і ўраду, усталяванай на яго. Наш Дзяржбанк, які павінен пляніраваць і сачыць, калі робіцца што-небудзь зьвыш пляну, таксама кацаўся ў паперах і ня бачыў фактаў раскраданьня дзяржаўных або грамадзкіх сродкаў кааперацыяй. Ёсьць нашая такая арганізацыя, як Наргасвучэт, які кожны месяц складае нам каментуарныя агляды і іншыя добрыя рэчы, друкуе «кніжкі з лічбамі і малюнкамі. Мы заклікалі да сабе гэтую арганізацыю: а ты што, бачыла, што тут з месяца ў месяц ты маеш павышэньне накладаньня, заўважыла гэта? — Не! Мы, кажа, толькі фіксуем тое, што ёсьць. Мы сказалі: дзякуй нашаму бацьку за такую фіксацыю, на якое ліха вы нам патрэбны, навошта сядзяць там сотні людзей для такой фіксацыі? Міліцыя і органы ДПУ змогуць ня так фіксаваць, як вы, а змогуць узяць шкодніцкуў, зладзеяў і адзаведным чынам пасадзіць куды трэба.

Але ня гледзячы на ўсе гэтыя недахопы, ня гледзячы на тое, што ў нас асобных частках нашага апарату ёсьць яшчэ маса гнілі, бюракратызму, ня гледзячы на раскраданьні ў нашасобных аддзеленьнях нашага апарату, — наша партыя і ўрад цьвёрдымі крокамі ідуць наперад і бязумоўна выканаюць праграму вызначаных ёю работ на 2-ую пяцігодку.

Крытыка і самакрытыка і выкрыцьцё ўсіх перажытчаных хваробітых зьяўлішч не зьяўляюцца мінусам, а толькі плюсам. Каручы хаго трэба, накіроўваючы каго трэба на правільны шлях, мы расчышчаем шлях для таго, каб выканаць другую пяцігодку з такім-жа гонарам, з якім мы выканалі і першую пяцігодку.

(Апладысмэнты).

ДЗЕНЬНІК СЭСІІ

11 ЛЮТАГА

РАНІШНЯЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ адкрыў тав. ЧАРВЯКОЎ.

З дакладам аб палітычным і арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, пасеўных плянах на 1933 год і аб практычных мерапрыемствах па ўзьмацненьні ўраджайнасьці выступіў Наркам зем БССР т. РАЧЫЦКІ.

БССР,—гаворыць т. Рачыцкі,—пры дапамозе Савецкага саюзу дабілася значных дасягненьняў у галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Колькасьць саўгасаў узрасла з 210 да 428. Тэрыторыя іх павялічылася больш чым у пяць раз. Колькасьць сялянскіх гаспадарак у калгасах павялічылася з 8.409 да 328 тыс. Пасеўная плошча сацыялістычнага сэктору складае звыш 50 проц. усёй пасеўнай плошчы БССР. Пасеўныя плошчы па рэспубліцы павялічыліся на 533 тыс. га. Створана магутная база сацыялістычнай жывёлагадоўлі з 6 тыс. калгасных таварных фэрм і звыш 400 саўгасаў.

Далей дакладчык прыводзіць рад цікавых лічбаў, якія характарызуюць вы сокую якасьць работы і значны рост ураджайнасьці ў радзе капіталістычных гаспадарак.

Але разам з перадавымі калгасамі, мы яшчэ маем шмат такіх, якія засьмечаны кулацка-варожымі элемэнтамі. У выніку там панус безгаспадарчасьць, нізкая каштоўнасьць працадня, нізкія даходы дзяржаўных заданьняў.

Аднак кулак пры ня толькі ў кіруючыя органы калгасаў, але мясцамі пранік і ў зямельныя органы, у МТС. У прыватнасьці, аказаўся зусім засьмечаным апарат Наркамзему, дзе выяўлены шмат былых людзей, дочак і сы ноў кулакоў і земскіх начальнікаў.

Х... ніку да апошняга часу ў некаторых мясцох працягвалася кулацка-нацыянальная прышчэпаўская палітыка, на ажэньнем хутары і пасёлкі. Практыка заняпупарадкаваньня ў калгасах была яўна шкодніцкай. Плошча разьбівалася на вучастки, якія прыкладна, нагадваюць хутары, нагадваюць сыстэму стапылінскай хутарызацыі з ацэнкай земельных ужытковасьцяй. Гэта сьведчыць аб блізкарукасьці савецкіх і партыйных арганізацый на месцах, якія ня ўсвоілі новай тактыкі кулака ў барацьбе з мерапрыемствамі партыі і ўраду.

ТАМУ НА САВЕТЫ ЗАРАЗ УСКЛАДАЕЦЦА АДКАЗНЬНЕЙШАЯ ЗАДАЧА ПА АЧЫСТЦЫ КАЛГАСАЎ АД ШКОДНІЦКІХ І КУЛАЦКІХ ЭЛЕМЭНТАЎ. САВЕТЫ ПАВІННЫ ПАСТАВІЦЬ НА АДКАЗНЬНЕЙШЫЯ ВУЧАСТКІ НА ДЗЕЙНЫХ, АДДАНЫХ РАБОЧАЙ КЛЯСЕ І ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЗЯРЖАВЕ КАЛГАСЬНІКАЎ.

Далей т. Рачыцкі спынаецца на практычных задачах у сувязі з падрыхтоўкай да весняной сяўбы.

З дакладам аб будаўніцтве савецкіх гаспадарак і задачах саўгасаў у сувязі з надыходзячай сяўбой выступіў упаўнаважаны Наркамсаўгасу СССР т. ЖОЛУДАЎ.

Пасьля дакладаў разгарнуліся спрэчкі. На ранішнім пасяджэньні ў спрэчках выступілі т. т. АНАЦКІ (Лагойскі раён), ВАЗЮК (Дзяржынскі раён), ДАРОЖКІН (Акадэмія Навук), ЖОГАЎ (Мазырскі раён) і ВОЎК (Бярэзінскі раён).

НА ВЯЧЭРНІМ ПАСЯДЖЭНЬНІ адгукнуліся спрэчкі па дакладах Наркамзема і ўпаўнаважанага Наркамсаўгасу. У спрэчках выступілі т. т. ЛУКЯНЧЫК (Плешчаніцы), ДУБІНА (упаўнаважаны Наркамсувязі), акадэмік АФАНАСЬСЕЎ, БЕРАСЬЦЕНЬ (Віцебскі раён), нам. наркома РСІ т. ТУРЛАЙ, праф. БАХЦЕЕЎ (Акадэмія Навук), МАРКІЯ НАЎ (Попацак), НАМ. СТАРШЫНІ СНК БССР т. БЭНЭ, УСУКОЎСКІ (Чырвона-Слабодзкі раён), ЛЕЛЯ (Асіпавіцкі раён) і т. СТРЭЛЕ.

Аб парадку работы IV сэсіі ЦВК БССР

13 лютага 1933 году

...ніцой 13 лютага будуць працаваць камісіі сэсіі ЦВК.

Вячэрняе заключнае пасяджэньне сэсіі пачнецца а 7 гадзіне. На вячэрнім пасяджэньні будзе заслухан даклад тав. М. П. Гнілякевіча аб заканадаўчых важнейшых пастаноў прэзыдыуму ЦВК, прынятых у час па між III і IV сэсіямі ЦВК БССР, а таксама будуць прымацца пастановы па заслуханых сэсіяй дакладах.

Сакратар ЦВК БССР М. П. ГНІЛЯКЕВІЧ.

13 ЛЮТАГА Ў 5 ГАДЗ. 30 ХВІЛІН АДБУДЗЕЦЦА

ПАСЯДЖЭНЬНЕ КАМУНІСТЫЧНАЙ ФРАКЦЫІ ЦВК БССР

у залі пяджэньня сэсіі—дом сялянства (былы клюб К. Маркса)

*

СПЫНІЦЬ ВЕДАМСТВЕННУЮ ГРЫЗЬНЮ ВАКОЛ РАМОНТУ ТРАКТАРАЎ І ВЫРАБУ ЗАПАСНЫХ ЧАСТАК

Замест рамонту—грызьня

Згодна пастановы ЦК КП(б)Б, адказнасьць за рамонт трактарнага парку і прычэпнага інвэнтару і выраб запасных частак ускладзены на **Белмэталяаб'яднаньне, Наркамзем, Наркамцяжпрам і трактарацэнтры.** Гэтыя ўстановы павінны былі своячасова дагаварыцца аб тым, якія машыны, колькі і кім (якімі заводамі і г. д.) павінны быць адрамантаваны, падрыхтаваны да веснавой сяўбы, а таксама, у які тэрмін і якімі матар' яламі.

У якім становішчы зараз знаходзіцца гэта, вельмі важная справа, якая набывае вялікае палітычнае значэньне? Як рамантуецца інвэнтар, дзе і колькі? Як ідзе выраб запасных частак? Хто і як з названых устаноў праявіў ініцыятыву?

На 10 лютага ўсяго па Беларусі па плану было быць адрамантавана 60 процантаў усіх трактараў, а выканана гэта заданьне толькі на 28 проц. Плугоў-трактарных адрамантавана 35 проц., плугоў конных — 30 проц., сэзярак трактарных — 21 проц., калёс — 27 проц.

Яшчэ горш стаіць справа на асобных раёнах, асабліва па Менскім. Трактараў адрамантавана 11 проц., сэзярак — 39 проц., плугоў трактарных — 41 проц., калёс — 29 проц., плугоў конных — 38 проц.

А самы адсталы вучастак у гэтай галіне — гэта прыгародныя гаспадаркі. Па прыгородных гаспадарках БССР адрамантаваны на паказаны дзень усяго толькі тры трактары!

Як стаіць справа з запаснымі часткамі для трактараў і іншых машын? З дакладу прадстаўніка Наркамзему тав. Ёўдакімава выявілася, што на складах ёсьць калі 350.000 розных запасных частак, але тав. Ёўдакімаў не ведае і ня мог сказаць, што гэта за часткі, да якіх машын гэтыя часткі. Ён толькі запэўніў, што ніяк недэфіцытныя...

Горш за ўсё тое, што паміж гэтымі ўстановамі да сёньняшняга дня ідуць усім непатрэбныя ў гэтай справе спрэчкі, спрэчкі аб тым, хто павінен даць запасныя часткі, матар'ял для рамонту.

Адсюль і вынік. Заводы як-небудзь прыступілі да рамонту, а ўказаныя ўстановы ўсё ніяк «не згаворацца». Ёсьць небяспека, каб гэтыя спрэчкі не цягнуліся да весны, да сяўбы...

Прадстаўнік Белмэталяаб'яднаньня тав. **Левін** рашуча ставіць перад Наркамземам такія ўмовы: даць мэталяаб'яднаньню запасныя часткі для трактараў, даць варштаты для шліфовкі запасных частак, даць высокавугляродную сталь, даць, даць, даць!

Калі прадстаўнік Наркамзему адмовіўся задаволіць па вусім зразумелых прычынах, гэтыя патрабаваньні, тады тав. Левін усю віну за несвоячасовы рамонт ускладае на Наркамзем. Мала таго, тав. Левін, пасылаючы дырэктыву на месцы, прадпрыемствам, прыкладае копію пратаколу нарады, у якой зафіксаваны ўсе вымаганьні мэталяаб'яднаньня і копію адмаўленьня Наркамзема задаволіць іх. Гэтым т. Левін спадзеецца ўпікнуць адказасьці. І ўсё гэта робіцца пасьля рашэньня, не дапускаючай ніякіх адхіленьняў у бок пастановы ЦК КП(б)Б аб рамонце трактараў.

Замест таго, каб канкрэтна прыступіць да выкананьня гэтай пастановы, імкнуцца яе абыйсьці, зваліць віну адзін на другога, займаюцца надуманьніцтвам і ведамсьтвенай грызьнёй.

Іван ківае на Пятра, а Пётра на Івана. Мэталяаб'яднаньне і НКЗем абвінавачваюць іх, што яны не мабілізаваны на выкананьне рашэньняў партыі. А тымчасам яшчэ не ва ўсе заводы запасены трактары для рамонту. Наркамзем яшчэ ня вывіў сапраўдных патрэбнасьці запасных частак.

Трэба адзначыць, што ні адна з партыйных гэтых устаноў не ўзялася за канкрэтную і цьвёрдую праверку, за жывое кіраўніцтва ў гэтай рабоце.

Ц-ш.

Папка блытаных паперак

МАГІЛЁЎ. (Наш кар.). Рамонт трактараў яшчэ не пачаўся. Іх на заводзе няма, але-ж затое ў канцылярыі завода кіраўніцтва ёсьць ужо цэлая папка з адносінамі, тэлеграмамі ад Белмэталяаб'яднаньня, ад Наркамцяжпрому. Папка даволі вялікая. У ёй шмат паперак, але апрача блытаніны там нічога ня знойдзеш.

10 студзеня за подпісам намесьніка дырэктара Белмэталяаб'яднаньня завод атрымаў загад: «Машынабудаўнічаму заводу «Чырвоны адраджэнец» патрэбна загатовіць 500 поршневых абручыкаў для трактара ХТЗ». Дырэкцыя заводу разьмеркавала гэты шэйн паміж варштатамі з такім разьлікам, каб да 15-га выпусьціць гэту колькасьць абручыкаў.

20 студзеня атрымліваецца другі загад, але ўжо па тэрсту, а Наркамцяжпрому аб тым, што завод «Чырвоны адраджэнец» поршневых абручыкаў не выпускае, яны размяркоўваюцца паміж Гомсельмашам і «Каму трэба», а «Чырвоны адраджэнец» павінен рамантаваць трактары.

23 студзеня прыходзіць паперка ад Белмэталяаб'яднаньня, у якой гаворыцца, што за выпуск запасных частак адказвае дырэктар заводу. Гэта першыя радкі адносны. Далей — дырэктару заводу прапануецца паведаміць ці атрыманы балванкі ад заводу імя Варашылава (Менск). Гэта ад заводу, які знаходзіцца па адлегласьці пекалькіх кварталаў ад трэсту.

Для таго, каб выпусьціць 5.000 поршневых абручыкаў, завод павінен быў ужо зараз атрымаць балванкі ад заводу імя Варашылава. Завод «Адраджэнец» можа выпусьціць ня толькі 5 тысяч абручыкаў, але значна больш, бо з 40 такарных варштатаў палкам нагружаны толькі 15-20, а рэшта можа тачыць абручыкі. Але-ж для гэтага завод павінен быў ужо атрымаць балванкі, з тым, каб прыступіць да работкі іх, бо ў сваіх запасах ён гэтага адліць ня можа.

Дырэкцыя заводу «Адраджэнец» пакіравала 3 тэлеграмы з патрабаваньнем ад заводу імя Варашылава ўказаць дакладна тэрмін адгрузкі балванак і толькі на трэцюю тэлеграму атрымаўся адказ, што частка будзе пакіравана 15 лютага, а частка 1 сакавіка г. г. І ў канцы дадаецца: «Прымаем усе захады да выкананьня вашага заказу». Добрыя захады! Да 15 сакавіка патрэбна ўжо адтачыць абручыкі і здаць МТС, а яны толькі 1 сакавіка прышлюць балванкі на завод. Гэтага нельга інакш назваць, як зрыў выкананьня дырэктыў ЦК КП(б)Б аб выпуску запасных частак.

Як дырэкцыя Белмэталяаб'яднаньня, так і дырэкцыя заводу «Адраджэнец» і імя Варашылава нічога не зрабілі, каб паскорыць тэмпы выпуску запасных частак.

Антыдзярж[illegible]дзіцы яшчэ [illegible]пануюць як у [illegible]тах і на заводах.

Гэта—з запаснымі часткамі і трактарамі. Але-ж завод «Адраджэнец» можа яшчэ рамантаваць і іншыя склады сельска-гаспадарчыя машыны. Толькі кіраўніцтва заводу аб гэтым ня турбуецца. Тав. **Казлоў** — дырэктар заводу «Адраджэнец» — адказвае:

— Я калёў загатоўку дроўнік і старшыні РКК, яны мне нічога не сказалі.

Завод «Адраджэнец» можа выпусьціць ня толькі 5 тысяч поршневых абручыкаў, ён можа ўвесь год працаваць над выпускам запасных частак. Завод на сваёй моцнасьці можа зараз адрамантаваць немалую колькасьць трактараў. Дырэкцыя заводу, дырэкцыя Белмэталяаб'яднаньня павінны пакінуць адпісваньня паперкамі. Завод павінен атрымаць трактары і балванкі з тым, каб выйсьці пераможам у выкананьні плану рамонту і выпуску запасных частак.

Н. Нэйдлін.

ЧОРНЫ СЬПІС

раёнаў, якія зрываюць ссыпку насенных фондаў

Месяц таму назад быў апошні тэрмін, вызначаны ўрадам для скончэньня ссыпкі насеньня. Ня гледзячы на гэта, ссыпка насеньня па БССР яшчэ ня скончана ні па адной культуры. Рад раёнаў ганебна зрываюць важнейшае мерапрыемства па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, не даюць адпору кулацкаму сабатажу, ня кіруюць ссыпкай і ачысткай насеньня як у калгасах, так і аднаасобным сэктары.

За зрыў ссыпкі і ачысткі насенных фондаў, за нядзольнасьць мабілізаваць актыўнасьць калгаснікаў, беднякоў і сярэднякоў — аднаасобнікаў на разгортваньне падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ЗАНОСІМ У ЧОРНЫ СЬПІС наступныя раёны:

ЗА ЗРЫЎ ССЫПКІ ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР

ПРАПОЙСКІ — 68 проц., СІРОЦІНСКІ — 70,6 проц., ВЕТКАЎСКІ — 75,8 проц., ГАРАДОЦКІ—76,6 проц., ЖЛОБІНСКІ — 78,6 проц., ЛАГОЙСКІ — 79,2 проц., ПЛЕШЧАНІЦКІ — 79,6 проц.

ЗА ЗРЫЎ ССЫПКІ НАСЕНЬНЯ ІЛЬНУ

РАСОНСКІ — 19,7 проц., ПОЛАЦКІ — 28,7 проц., АСЬВЕЙСКІ — 31,1 проц., ДРЫСЕНСКІ — 28,6 проц., ЛЕПЕЛЬСКІ — 44,7 проц., СЕНЬНЕНСКІ — 46 проц., ЧШЛОЎСКІ—50,5 проц., СІРОЦІНСКІ — 55 проц., ВІЦЕБСКІ — 55,5 проц., МЕНСКІ — 55,5 проц., БЕШАНКОВІЦКІ — 55,5 проц., ЗАСЛАЎСКІ — 55,7 проц., ГАРАДОЦКІ — 56 проц., БЯЛЫНІЦКІ—60,9 проц., КРУПСКІ — 61,4 проц., ТАЛАЧЫНСКІ — 64 проц., ПЛЕШЧАНІЦКІ — 69,5 проц., БЯГОМЛЬСКІ—69,6 проц.

ЗА ЗРЫЎ ССЫПКІ НАСЕНЬНЯ КАНАПЕЛЬ

НАРАЎЛЯНСКІ — 41,3 проц., ХОЙНІЦКІ — 43,1 проц., КАРМЯНСКІ — 58,6 проц., ЗАСЛАЎСКІ — 59,7 проц., ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ—69,8 проц., ЖЫТКАВІЦКІ — 63,2 проц., СТАРОБІНСКІ —65,9 проц., РЭЧЫЦКІ—66,2 проц., ЛЮБАНЬСКІ — 68,2 проц.

ЗА ЗРЫЎ ССЫПКІ НАСЕНЬНЯ БУЛЬБЫ

ЧАШНІЦКІ — 67,9 проц., ЛОЕЎСКІ — 70,9 проц., БЕШАНКОВІЦКІ —70,2 проц., ГАРАДОЦКІ—74 проц., НАРАЎЛЯНСКІ — 76,5 проц., РАСОНСКІ — 77,5 проц., ПЯТРЫКОЎСКІ—77,5 проц., ЧЭРВЕНЬСКІ — 77,6 проц., КАРМЯНСКІ — 78,5 проц. і ВЕТКАЎСКІ—79,6 проц.

К. Бэнэк

Бальшавіцкая барацьба з гнілым лібэралізмам—зарука поўнага выканаьня пляну ільназагатовак

Тэмпы ільназагатовак па БССР зусім нездавальняючыя. За апошнюю дэкаду тэмпы яшчэ больш знізіліся, прычым апошняя пяцідзёўка дае зьніжэньне загатовак са дня па дзень.

У выніку гэтага маем такое ганебнае становішча, калі на 9 лютага г. г. загатоўкі ільнавалакна выкананы толькі на 85,5 проц. гадавога пляну.

Ня гледзячы на неаднаразовыя катэгарычныя ўказаньні ЦК КП(б)Б і СНК аб бязумоўным і поўным выкананьні пляну да 1 лютага, рад ільнаводчых і неільнаводчых раёнаў недапушчальна адстае ў ільназагатоўках. Да найбольш адстаючых раёнаў трэба аднесьці: Бешанковіцкі, Вушацкі, Сяроцінскі, Мсьціслаўскі, Асьвейскі, Расонскі, Дрысенскі, Сенненскі, Полацкі, Гарадоцкі, Горацкі, Рэчыцкі, Чэрвеньскі і інш.

У гэтых раёнах няма яшчэ разгорнутай бальшавіцкай барацьбы з гнілым лібэралізмам, няма бальшавіцкай барацьбы за лён. Рад партыйных зьвеньняў, савецкіх і загатоўчых арганізацый і нават паасобныя кіруючыя работнікі прымірэнча адносяцца да перажыткаў, якія ня толькі выкажаць, але і знаў па перавыкананьне свае пляны.

Дэмабілізацыйныя настроі ў ільназагатоўках адбіваюць кулацкае супраціўленьне. Удар па гэтых настроях зьяўляецца неабходнай умовай поўнага выкананьня пляну загатовак. Дэмабілізацыйныя настроі асабліва ўзмацніліся ў сувязі з выездам з раёну раёнкаў упаўнаважаных і другіх работнікаў, пасланых ЦК КП(б)Б у дапамогу раёнам.

Кожная раённая партыйная арганізацыя поўнасьцю адказвае за выкананьне пляну загатовак. Ад арганізацыі яе работы, расстаноўкі сіл залежыць посьпех кампаніі. Неабходна навесьці рашучую барацьбу са ўсякімі стробамі аслаблення ходу ільназагатовак.

Дэмабілізацыйныя настроі праяўляюцца і ў тым, што замест барацьбы за пляны, раённыя работнікі пачынаюць шукаць прычыны «немагчымасьці» выкананьня плян у падсавгасе, вясковым, градабіцкі і інш. «прычынах», якія льюць ваду на млын кулака, дэмабілізуюць партарганізацыю і вядуць да зрыву выкананьня заданьня пляну ільназагатовак.

Дэмабілізацыйныя настроі праяўляюцца і ў спробах ліквідаваць ільназагатканторы (Парычы), у скарыстаньні асноўных работнікаў ільназагатканторы на іншыя работы (Лёзна) і г. д.

Дэмабілізацыйныя настроі павінны быць выкананы ў канца. Кожны раён, калгас, вёска і гаспадарка павінны выкананць поўнасьцю, заданьне. Бальшавіцкія паказы работы паасобных раёнаў, якія выяўляюцца ў масавай працы сярод калгаснікаў, беднякоў і сярэднякоў і барацьбе з кулацкімі элементамі і тэндэнцыямі, пацьвярджаюць, што гэта цалкам выравальная задача.

Бальшавіцкая барацьба з гнілым лібэралізмам і кулацкімі тэндэнцыямі гаўніна быць даведзена да канца.

Побач з поўным выкананьнем пляну ільназагатовак, кожным раёнам, вёскай, калгасам адпасобным двором неабходна арганізаваць пераарапраўку ніжэйшых гатункаў ільнасыроў і нізкіх гатункаў ільнавалакна. Кожны кілёграм ільну, які ў выніку адсутнасьці ўвагі да жасьці ільну з боку загатоўчых і паасобных партарганізацый ператворан у паклю, сырэц — павінен быць пераапрацоваш у добраякасное ільнавалакно і здан сацыялістычнай прамысловасьці.

Побач з гэтым неабходна рашуча паправіць усе загатоўчыя і партарганізацыі супроць шуканьня новых «процантаў» выкананьня пляну на складах. Ён трэба атрымаць на вёсцы, у калгасе і ў гэтым — асноўная задача. Дзеяпрацоўкай, пераапрацоўкай ільну трэба займацца, але гэта справа павінна быць арганізавана ня ў страту ільназагатоўкам.

Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б партыйная арганізацыя Беларусі атрымала перамогі на фронце загатовак бульбы, збожжа, мяса (за 1 квартал). У барацьбе з кулаком, выкрываючы гнілы лібэралізм, апартунізм, КП(б)Б даб'ецца перамогі на фронце ільназагатовак у бліжэйшыя-ж дні.

Напярэдадні 15 гадавіны Чырвонай арміі

ГОМЕЛЬ

★ Асоавіяхімаўская арганізацыя камбінату «Спартак» абвясьціла ЎНУТРЫЗАВОДЗКІ КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ЯЧЭЙКУ АСОАВІЯХІМУ. Да гадавіны Чырвонай арміі выпускаецца 20 стралкоў.

★ Рабочыя замоду імя Ланцуцкага арганізуюць ВЫЕЗД У ПАДШЭФНЫЯ КАЛГАСЫ для правядзеньня падрыхтоўчай работы да сьвяткаваньня 15-годзьдзя Чырвонай арміі і арганізацыі ў калгасах ячэек Асоавіяхіму.

★ Ячэйкі Асоавіяхіму мэханічнага, на пёснага, вагоннага і зборачнага цэхаў заводу імя Ланцуцкага ўзялі на сябе абавязацельствы АСТАЛЯВАЦЬ У КАЗАРМАХ ПАДШЭФНЫХ ЧАСЬЦЕЙ ТРЫ ЧЫРВОНЫЯ КУТКІ. Да гадавіны прыстасоўваецца прамяваньне ўдарнікаў абароны.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

КІНО „СПАРТАК“ — З 13 лютага новы мастацкі фільм **СУДЗЬДЗЯ РЭЙТОН** Драма ў 6 частках. Штодзенна 5 сэансаў. Каса—ад 1 г. дня

Чырв. Зорка — Каса—ад 1 г. дня — новы мастацкі фільм **БЛІСКУЧАЯ КАР'ЕРА** Звыш праграмы хроніка Саюзкіно

Інтэрнацыянал — Каса—ад 12 г. дня — Мастацкі фільм **КАЛАМУТА** Кіно-хроніка Саюзкіно

Кіно ПРАЛЕТАРЫ — 1) Замежны мастацкі фільм **Па прасёлачных дарогах** 2) Кіно-хроніка Саюзкіно. Дзённыя дзіцячыя сэансы 1) **З дні в коньнічай** у 3 ч. 2) **Трывога С. П. А.** у 2-х ч.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР — 16-га лютага — ТОЛЬКІ АДЗІН КАНЦЭРТ заслужанага артыста рэспублікі праф. Маскоўскай кансэрваторыі скрыпача-віртуоза **Міхаіла ЭРДЭНКА** пры ўдзеле: салістки-піяністкі Дзіны Гольцэр. Пачатак у 8 з палов. гадзін веч. Білеты продаюцца штодзенна ў рабочай касе з 12 да 2 і з 4 да 6 г. веч., а таксама і ў касе тэатру

СЁНЬНЯ, 13 ЛЮТАГА, У ПАМЯЖК АДЬНІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРУ — АДБУДЗЕЦЦА — **АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ ВЕЧАР СУСТРЭЧЫ РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ** ПРАДПРЫЕМСТВАЎ г. МЕНСКУ **з дэлегатамі БССР на Усесаюзны зьезд калгасьцінаў-ударнікаў.** Пачатак роўна у 7 гадзін вечара. Члены ЦВК, СНК, ЦК, ЦКК, ГК КП(б)Б, ГКК, гарсавету, ЦСПСБ, гарпрафсавету праходзяць па сваіх мандатах. Білеты прадпрыемствы атрымліваюць у Арг. Аддзеле Горсавету. ГАРСАВЕТ І ГАРПРАФСАВЕТ.

Польскі рабочы клюб імя Р. Люксэмбург — Сёньня, у 7 гадз. вечара адбудзецца **агульны сход працоўных поляк ў гор. Менску** З дакладам аб міжнародным становішчы выступіць т. БУ[illegible]ЗІНСКІ. Пасьля дакладу—КАН ЦЭРТ. Уваход вольны. Праўленьне клюбу

ПАСТАНОВА

НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ПРАЦЫ Б. С. С. Р.

11 Лютага 1933 г. № 3 г. Менск

ПРА СУМЯШЧЭНЬНЕ

У развіцьцё п. 7 пастановы СНК БССР за 25 студзеня 1933 г. „пра вынікі скарачэньня штатаў і ліквідацыю аб'яднаньняў, прадстаўніцтва і кантор саюзных і іншых арганізацый у БССР“ („Савецкая Беларусь“ за 1 лютага № 26) Народны Камісарыят Працы БССР

ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Забараніць сумяшчэньне ва ўсіх дзяржаўных, гаспадарчых і кааперацыйных прадпрыемствах і установах, падпарадкаваных аднэй і тэй-жа сыстэме ці хоць непасрэдна і непадпарадкаваных, але-ж якія знаходзяцца ў якой небудзь кантрольнай ці адміністрацыйна-гаспадарчай залежнасьці.

2. Сумяшчэньнем зьяўляецца выкананьне аднай і тэй-жа асобай работы па найму ў 2-х або некалькіх прадпрыемствах ці ўстановах як ва ўрочны, так і ў няўрочны час.

3. Выкананьне розных абавязкаў у аднэй і тэй-жа ўстанове не зьяўляецца сумяшчэньнем і ў гэтым выпадку работнік, які выконвае розныя абавязкі, павінен аплачвацца выключна па аднэй стаўцы ў адпаведнасьці з арт. 62 Код. аб працы БССР.

4. Ня лічыцца сумяшчэньнем педагагічная, мастацкая і літаратурная работа. Сумяшчэньне мэд. работнікаў рэгулюецца пастановай Наркампраці СССР за 10-I—32 г. № 7. (Изв. НКП СССР 1932 г. № 8-9).

5. Сумяшчэньне пасад ва ўстановах, прадпрыемствах і арганізацыях, непадпарадкаваных аднэй сыстэме, дапускаецца толькі ў выключных выпадках у адносінах высока-кваліфікаваных работнікаў з дазволу ў кожным паасобным выпадку раённага (гарадзкога) органу працы і з папярэдняй зводы тэй установы, у якой работнік выконвае асноўную работу.

6. Гар. і райінспэктары працы могуць выдаць дазвол на права сумяшчэньня выключна ў выпадках:

а) калі ўстаноўлена сапраўдная неабходнасьць таго ці іншага сумяшчэньня;

б) калі пасада, на якую запрашаецца работнік для работы па сумяшчэньні, прадугледжана штатамі, зацьверджанымі органамі РСІ.

7. Работа па сумяшчэньні аплачваецца ў залежнасьці ад фактычнага аб'ёму і працяжнасьці работы па сумяшчаемай пасадзе, аднак ня звыш 50 проц. вызначанай для гэтай пасады стаўкі.

Канкрэтны размер аплаты за работу па сумяшчэньні ў межах 50 проц. устанаўляецца органамі працы пры выдачы дазволу на сумяшчэньне.

8. Вінаватыя ў парушэньні гэтай пастановы, як самі работнікі, якія сумяшчаюць, так і кіраўнікі прадпрыемстваў, і ўстаноў, прыняўшыя гэтых работнікаў на работу, прыцягваюцца да адказнасьці як за службовае злачынства ў адпаведнасьці з арт. 197 кр. код. БССР

9. Пастанова Наркампраці БССР за 1/VI—1928 г. № 40 „Пра ўмовы працы па сумяшчэньні“ [Бюлетэнь СНК БССР 1928 г. № 7] касуецца

Народны камісар працы БССР **Баскін.**

УЗГОДНЕНА:

З ЦКК-НК РСІ член калегіі НК-РСІ **Касьцюковіч.**

З ЦСПСБ член прэзыдыуму **Е. Левін**

п. 8 Н. К. Ю. БССР Нам. НАРКАМЮСТУ БССР **Фанбург.**

ПАСТАНОВА

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

8 лютага 1933 г. г. Менск.

Аб вызначэньні па кожным доме адказных асоб за прыпіску ў аддзяленьнях міліцыі гор. Менску дакумантаў асоб, прыбываючых на жыхарства ў г. Менск і ўбываючых з яго

У мэтах удасканаленьня прапіскі дакумантаў асоб, прыбываючых на жыхарства ў гор. Менск і ўбываючых з яго, **Менскі Гарадзкі Савет Рабочых Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. Абавязаць праўленьні жактаў вызначыць па кожным доме адказную асобу за прапіску дакумантаў прыбываючых і ўбываючых грамадзян.

2. Абавязаць усе прадпрыемствы, дзяржаўныя ўстановы і грамадзкія арганізацыі, маючыя належныя ім дамы і інтэрнаты, у якіх праживаюць рабочыя і служачыя, а таксама і адміністрацыю гасьцініцы і заезных двароў вызначыць па кожным доме, інтэрнаце гасьцініцы, заезным дварэ адказную асобу за прапіску дакумантаў прыбываючых і ўбываючых грамадзян.

3. усклясьці абавязак прапіскі дакумантаў прыбываючых і ўбываючых грамадзян на прыватных дамох на ўласьнікаў гэтых дамоў.

4. Абавязаць жыльлёвую кааперацыю, адміністрацыю прадпрыемстваў, дзяржаўных і грамадзкіх устаноў і арганізацый да 15-II 1933 г. прадставіць галоўнаму кіраўніцтву РС міліцыі пры СНК БССР (г. Менск, Камуністычная, 1-7) СЬПІСЫ АДКАЗНЫХ АСОБ, вылучаных паводле п. п. 1 і 2 гэтай пастановы па кожным доме, інтэрнаце, гасьцініцы і заезным дварэ, па наступнай форме: №№ п. ч., прозьвішча, імя і імя па бацьку, год і месяц нараджэньня, партыйнасьць, сацыяльнае становішча, месца службы і пасада, па якім доме вылучан адказным (паказаць вуліцу і № дому). Хатні адрас.

УВАГА: Домаўладальні, положачыя прыватным асобам, гэтых вестак не прадстаўляюць.

5. Усклясьці абавязак на вылучаных адказных асоб па кожным доме, інтэрнаце, гасьцініцы, заезным дварэ:

а) хаваньне дамовых кніг;

б) патрабаваньне ад прыбываючых і выбываючых грамадзян дакумантаў для прыпіскі;

в) нагляд за сваячасовым і дакладным запаўненьнем картак на прыбыўшых і ўбыўшых і запісаў у адпаведных графах дамовых кніг неабходных вестак.

г) нагляд за сваячасовым прадстаўленьнем у аддзяленьні міліцыі гораду Менску для прыпіскі дакумантаў.

6. Вінаватыя ў непрадстаўленьні ва ўстаноўлены тэрмін патрабуемых вестак адказныя асобы за прыпіску прыцягваюцца да адказнасьці ў адміністрацыйным парадку—штрафу да 100 руб., або прымусовых работ да 15 дзён.

Нам. старшыні Менскага Гарсавету **Каранеўскі.**

Ва сакратара Гарсавету **Ягоўдзін.**

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

3 лютага 1933 г. № 75 гор. Менск.

Аб ачыстцы вуліц, тратуараў і стрэх ад сьнегу

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць усе ЖАК'ты, дзяржаўныя ўстановы, грамадзкія арганізацыі, арэндатараў і ўласьнікаў будынкаў і незабудаваных зямельных вучасткаў у горадзе Менску, штодзенна да 8-мі гадзін раніцы чысьціць тратуары, вуліцы і рыўткі ад сьнегу і лёду і **кожны дзень пасыпаць тратуары пяском,** прарубіць рыўткі і ўвесь пухкі сьнег на вуліцах і плошчах згрэбсьці ў кучы і вывезьці ў адведныя месцы, паказаныя ў п. 3.

УВАГА: Сьнег і лёд з вуліц і тратуараў павінен ачышчацца так, каб пры ачыстцы яго не псаваўся тратуар або брук. Сурова забараняецца скольваць сьнег і лёд на тратуарах і клінкерных маставых ламамі, кіркамі сякерамі і інш. вострымі прыладамі.

2. У выпадку паданьня сьнегу на працягу усяго дня, ачыстка тратуараў і зьмятаньне пухкага сьнегу з вуліц і плошчаў робіцца па некалькі разоў у дзень з такім разьлікам, каб гэта не перашкаджала вулічнаму руху.

3. Сабраныя кучы сьнегу і лёду вывозяцца на працягу сутак у наступныя месцы звалак:

а) каля калгасу „Адраджэньне (раён Кальварыя);
б) „ „ імя Дзяржынскага (Малая Сьляпянка);
в) „ „ імя ЦВК (Лошыца);
г) каля арцелі „Агароднік“ (Тры Карчмы);
д) „ „Свабода“ (Пярэспа);
е) „ „Чырвоная зорка“ (в. Сталовая).

4. Абавязаць домакіраўніцтвы сачыць за ачысткай сьнегу і лёду накрываў пажарных студняў, гарадзкога водаправоду, каналізацыі і АТС, якія знаходзяцца на прылягаючых да іх дамаўладаньняў вуліцах.

5. З падыходам поўнага веснавога раставаньня сьнегу, лёд на забрукаваных вуліцах павінен скольвацца і вывозіцца парадкам паказаным у п. п. 1 і 3 гэтай абавязковай пастановы.

6. Абавязаць трэст зялёных насаджэньняў штодзенна ачышчаць ад сьнегу сьцежкі, лесьніцы і лаўкі на скверах, пасыпаючы пяском сьцежкі і лесьніцы.

7. З падыходам вясны, сьнег і лёд са стрэх павінен быць скінуты з захаваньнем наступных мер перасьцярогі:

а) тратуары і вуліцы перад дамамі павінны быць загароджаны;

б) скідаць сьнег трэба такім парадкам, каб папярэдзіць псаваньне электрычных, тэлеграфных і тэлефонных правадоў і вулічных ліхтароў.

Увага: У выпадку папсаваньня правадоў і ліхтароў домакіраўніцтвы будуць падлягаць апрача штрафу (п. 9) апла це ўсяго кошту зробленых папсаваньняў.

в) ачыстка стрэх робіцца раніцою і павінна быць скончана да 10 гадз., а скінуты сьнег і лёд—вывезены ў парадку, паказаным у п. 3 гэтай пастановы.

8. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на РС Міліцыю.

9. Асобы вінаватыя ў невыкананьні гэтай абавязковай пастановы падлягаюць адказнасьці ў адміністрацыйным парадку—штрафу да 100 руб., або прымусовым работам да 15 дзён.

10. Гэта абавязковая пастанова набывае моц з дня апублікаваньня.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету **ВАЛОДЗЬКА.**

За сакратара Менгарсавету **ЯГОЎДЗІН.**

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337

За дапушчаную пратэрміноўку пазычкі ў суме 539644 руб. ЛЕЛЬЧЫЦКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ДЗЯРЖБАНКУ ПРАДАЕ ЛЕСАМАТАР'ЯЛЫ, дровы і розную маемасьць Лельчыцкага Леспрамгасу. Арганізацыі, жадаючыя купіць, з прапановамі і за даведкамі могуць зварачацца у Лельчыцкае аддзяленьне Дзяржбанку.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2